

**Хлебаробы ў пагонах**

СТАР. 3

**Узляцець на аўтажыры**

СТАР. 3

**Фотаздымак натхніў на вершы...**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

19 ЖНІЎНЯ 2015 г. СЕРАДА № 157 (28015) Кошт 2000 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

# ЁСЦЬ РЭКОРД!

**Унікальныя ў гісторыі айчыннай сельскай гаспадаркі дыпломы ўручаны перадавым камбайнерам агракамбіната «Ждановічы» Віктару Стэльмаху і Міхаілу Саладуху. Кожны з іх намалаціў сёлета больш за 5 тысяч тон зерня. Такі вынік на беларускіх палетках дасягнуты ўпершыню. Герояў жніва ў полі павіншаваў генеральны дырэктар агракамбіната Рыгор Чуйко. Ён зазначыў, што ў гаспадарцы ўжо намалочана больш за 40 тысяч тон зерня. Яшчэ 10 тысяч — і намечанае на гэтае лета будзе выканана. У гэты ж дзень у Мінскай вобласці ўстаноўлены яшчэ адзін рэкорд жніва. Намалот зерня ў рэгіёне перавысіў два мільёны тон. Сярод раёнаў самыя высокія вынікі па ўраджайнасці і валавым зборы — у хлебаробаў Нясвіжскага раёна. У дзесяці раёнаў вобласці ёсць шанц перавысіць 100-тысячны намалот. Узровень мінулага года перавысілі 8 раёнаў.**

**НА ЗДЫМКУ:** генеральны дырэктар агракамбіната Рыгор ЧУЙКО гутарыць з найлепшымі камбайнерамі Віктарам СТЭЛЬМАХАМ і Міхаілам САЛАДУХАМ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Br193,3 трлн**

*склаў рознічны тавараабарот у Беларусі ў студзені-ліпені 2015 года. Гэта на 1% больш, чым за аналагічны леташні перыяд. За сем месяцаў года доля продажу харчовых тавараў у рознічным тавараабароце склала 50,6%, нехарчовых тавараў — 49,4%. Насельніцтву прададзена харчовых тавараў на Br97,9 трлн, нехарчовых — на Br95,4 трлн, што складае адпаведна 101,2% і 100,8% да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. У разліку на душу насельніцтва рознічны тавараабарот з пачатку года склаў Br20,4 млн. Паводле інфармацыі Белстата, у студзені-ліпені 2014-га гэты паказчык складаў Br18,5 млн. У рознічным тавараабароце 82,2% прыпадае на арганізацыі гандлю, 17,8% — на рынкі, гандлёвыя цэнтры.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 16259,00 | ▲ |
| Еўра | 17973,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 246,66 | ▲ |
| Укр. грыўня | 735,70 | ▲ |

# УЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ: СІТУАЦЫЯ СТАБІЛЬНАЯ

**Прэзідэнт Аляксандр ЛУКАШЭНКА ўчора прыняў з дакладам выконваючага абавязкі дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Станіслава ЗАСЯ і міністра абароны Андрэя РАЎКОВА, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб сітуацыі ва Узброеных Сілах, перш за ўсё на паўднёвых рубяжах. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што вакол гэтай тэмы апошнім часам вельмі шмат размоў, у так званай апазіцыйнай прэсе тыя ці іншыя рэчы падаюцца тэндэнцыйна. «Тым не менш мы не ўтойваем тое, што паўднёвыя граніцы нам трэба ўзмацняць. І не таму што мы баімся ўкраінцаў, што на нас там хтосьці нападзе. Мы асцерагаемся, каб у выніку таго, што адбываецца ва Украіне, не пацягнуліся сюды розныя элементы, не патрэбныя ў Беларусі, і асабліва зброя. Гэта нас павінна заўсёды насцярожваць. Гэта наша пытанне, якое мы павінны вырашаць, за нас ніхто яго не вырашыць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, Прэзідэнту было даложана аб тым, як ідзе аптымізацыя Узброеных Сіл. Увага акцэнтавалася ў тым ліку на стварэнні новай зброі і новых відаў узбраення ў Беларусі. Кіраўніка дзяржавы цікавіла, ці ўсё выконваецца па параметрах, якія былі вызначаны нядаўна на пасяджэнні Савета бяспекі.

Станіслаў Зась праінфармаваў Аляксандра Лукашэнку, што сітуацыя ва Узброеных Сілах Беларусі стабільная. Адзначаецца ўмацаванне маральна-псіхалагічнага стану людзей, змяншэнне адтоку афіцэраў, у тым ліку маладых. Паспяхова прайшла ў гэтым годзе ўступная кампанія ў Ваенную акадэмію.

# ДЗЕЦІ ЎСЕ АДНОЛЬКАВЫЯ

## У краіне будзе максімальна шырока праведзена дабрачынная кампанія па падрыхтоўцы школьнікаў з маламаёмных, шматдзетных сем'яў

**Такое даручэнне даў учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам міністра адукацыі Міхаіла Жураўкова, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Падрыхтоўка да новага навучальнага года пачалася ўжо. Як было даложана кіраўніку дзяржавы, праблем з тым, каб сабраць дзіця ў школу, няма, можна набыць усё неабходнае — пачынаючы ад навучальных дапаможнікаў і заканчваючы адзеннем. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў краіне ўсталявалася добрая традыцыя падтрымліваць у падрыхтоўцы да школы маламаёмныя, шматдзетныя сем'і. «Трэба і ў бягучым годзе аб гэтым не забываць. І ў гэту кампанію падтрымкі трэба ўключыць усіх — ад Прэзідэнта да тых, хто можа дапамагчы апрануць, абуць дзетак», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Каб не было адрозненняў, што гэты з беднай сям'і, гэты з багатай сям'і. У нас дзеці ўсе аднолькавыя. Таму тут нам трэба зрабіць максімум», — дадаў ён.

У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка даручыў Міністэрству адукацыі арганізаваць работу, «каб напружыць усё грамадства і падрыхтаваць дзетак у школу». Пры гэтым асаблівую ўвагу, як адзначыў Прэзідэнт, неабходна ўдзяліць першакласнікам, якіх сёлета 106 тыс. — на 1,6 тыс. больш, чым у мінулым. «Гэта ўжо добрая тэндэнцыя. Нарэшце мы пераадолелі гэту дэмаграфічную яму, і ў нас з'яўляецца больш першаклашак», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, міністр адукацыі далажыў кіраўніку дзяржавы аб выніках уступнай кампаніі. У цэлым былі выкананы ўсе кантрольныя лічбы прыёму, асабліва на бюджэт і на запатрабаваныя эканомікай краіны спецыяльнасці.

Асобна Аляксандр Лукашэнка спыніўся на пытанні падрыхтоўкі кадраў па рабочых спецыяльнасцях, паколькі сітуацыя ў гэтай сферы складаная ў краінах СНД і Усходняй Еўропы. Між тым у Беларусі сістэму прафтэхадукацыі захавалі. Прэзідэнт пацікавіўся яе цяперашнім станам.

Прэзідэнт паставіў задачу па далейшым удасканаленні сістэмы прыёму, асабліва ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, сістэмы цэнтралізаванага тэсціравання. Кіраўніку дзяржавы даложана аб прапановах Міністэрства адукацыі, плануемых змяненнях з наступнага года ў прыёмнай кампаніі. У прыватнасці, будзе вырашацца пытанне аб здачы чатырох прадметаў на ЦТ, аб падачы дакументаў адначасова ў некалькі ВНУ па аднолькавым профілі. Акрамя таго, разглядаюцца некаторыя тэхнічныя змяненні, што датычацца самой працэдуры правядзення цэнтралізаванага тэсціравання. Міхаіл Жураўкоў адзначыў, што гэтыя пытанні будуць прапрацаваны і вынікі прадстаўлены будучым абітурыентам.

На сустрэчы была закранута таксама тэма прафесійнай адукацыі, павелічэння колькасці студэнтаў і навучэнцаў у сярэдніх спецыяльных установах, каледжах. Міністр падкрэсліў, што гэтаму напрамку ўдзяляецца асабліва ўвага. Размова ішла таксама аб развіцці сістэмы прафесійнай бесперапыннай адукацыі, ад вучылішч і каледжаў да ўніверсітэтаў, аб аптымізацыі сістэмы адукацыі.

■ Прамая лінія

# ВЫСОКІ ЦІСК? БУДЗЕМ ЛЯЧЫЦЬ!

**Боль у грудзях? Працяглы? Не знікае ні тады, калі вы стаіце, ні тады, калі ляжыце? Думаеце, што гэта бранхіт, пякотка, астэахандроз... Аднак на самай справе калі для апісання болю вы прыкладаеце далонь да грудной клеткі, ды яшчэ гэты боль аддае ў лапатку або сківіцу, то цалкам верагодна, што гэта інфаркт міякарда. Артэрыяльны ціск пры гэтым можа быць у норме і нават нізкім пры досыць маштабным пашкоджанні.**

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Што такое інфаркт? Як толькі сасуд, які забяспечвае пэўны ўчастак сэрца, аказваецца заблакіраваным тромбам або бляшкай, парушаецца харчаванне навакольнай тканкі — яна разбаўляецца кіслароду і карысных рэчываў, што дастаўляюцца з крывёй. Вынік — адміранне клетак. Медыкі іх у такім выпадку называюць «аглушанымі». Чым хутчэй аднавіць кровазварот і вывесці іх з гэтага стану, тым, вядома, лепш.

А таму калі боль у грудной клетцы не знікае некалькі хвілін, трэба разжаваць таблетку аспірыну, пад язык пакласці таблетку нітрагліцэрыну (можна да 3 таблетак з інтэрвалам 5 хвілін). Абавязкова выклікаць «хуткую». У 1-й, 2-й, 9-й, 10-й мінскіх гарадскіх бальніцах, бальніцы хуткай дапамогі, мінскай абласной працуюць ангіяграфічныя кабінеты, дзе такім пацыентам выконваецца каранараграфія — дыягнастычнае даследаванне, падчас якога выдаляецца тромб і ў сасуд ставіцца стэнт. Такім чынам істотна змяншаецца плошча пашкоджання сэрца, але зроблена гэта павінна быць як мага раней, у першыя 12 гадзін. Увогуле, залатым стандартам аказання дапамогі ў такіх выпадках лічацца першыя 90 хвілін з моманту прыезду хуткай дапамогі.

Аперацыі на адкрытым сэрцы — аортакаранарнае шунціраванне — выконваюцца ў выпадку ўзнікнення ўскладненняў інфаркту, калі ёсць анеўрызма, калі тромбы ўтварыліся не толькі ў артэрыях, але і ў поласцях сэрца і г.д. Звычайна такая аперацыя выконваецца пасля дыягнастычнай каранараграфіі.

Яшчэ больш падрабязнасцей — у адказах на пытанні нашых чытачоў **загадчыцы інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, урача-кардыёлага вышэйшай катэгорыі Наталлі ПАЛЯЎКОВАЙ**.

СТАР. 6

Сёння, **19 жніўня,** адбудзецца **ПРАМАЯ ЛІНІЯ** з **міністрам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Андрэем Марленавічам КАЎХУТАМ.**

Задаць пытанне міністру вы можаце ў гэты дзень **з 11 да 12 гадзін** па нумары: **8(017) 287 18 71.**

Папярэдне — па тэлефоне **8(017) 287 18 38** ці па электроннай пошце ***pryroda@zviazda.by***

(з пазнакай «На прамую лінію»).



# У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ — ДЗЕЦІ

## Аднайменная акцыя будзе доўжыцца ў краіне да канца верасня

**Пачатак навучальнага года — найлепшы час, каб нагадаць дзецям і іх бацькам пра правілы бяспечных паводзін. А яшчэ важна зрабіць гэта не ў форме лекцый, а праявіць крэатыў. Як жа пройдзе скіраваная на бяспеку дзяцей акцыя? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з прэс-сакратаром Мінскага гарадскога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталём Дэмбоўскім.**

### Пажарная амуніцыя сярод школьнай формы

— Наша прафілактычная акцыя праходзіць у тры этапы ў залежнасці ад ахопу мэтавай аўдыторыі. Першы з іх ужо распачаўся і скончыцца 31 жніўня. Пройдзе ён у буйных гандлёвых цэнтрах і закране некалькі секцый адначасова. Там, дзе прадаецца школьная форма і вопратка, будуць сярод іншых тавараў выстаўлены прыцягальна яркія камплекты баявой амуніцыі ратаўнікоў, наўмысна зменшаныя да дзіцячых памераў. На іх нанесена інфармацыя аб тым, колькі дзетак загінула пры пажарах. Яшчэ адно «гарачае» месца ў перадшкольную пару — аддзелы канцылярскіх тавараў. Там пакупнік знойдзе сярод звыклых ручак, алоўкаў і сшыткаў вогнетушыцелі і аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі. А актывісты Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі ратаўнікоў-пажарных будуць раздаваць наведвальнікам разнастайную наглядную прадукцыю, прысвечаную тэме бяспекі — брашуры, памяткі, календары.

СТАР. 6

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Украінскія школьнікі будуць вучыцца 12 гадоў

«Дзеці, якія пойдуць у школу ў 2016 годзе, скончаць 12-гадовую школу», — паведаміў міністр адукацыі і навукі Украіны Сяргей Квіт. Пры гэтым ён запэўніў, што пераход з дзеючай цяпер ва Украіне 11-гадовай сістэмы на 12-гадовую школьную адукацыю будзе паступовым. Аргументуючы неабходнасць павелічэння тэрміну навучання ў школе, Квіт адзначыў, што «нашы праграмы выклікаюць скаргі, яны перагружаны, нецікавыя».

### Мухамед — зноў самае англійскае імя

Самым папулярным імем Англіі і Уэльса стала імя Мухамед. Ён апярэдзіў нават традыцыйнага Олівера, як перадае Daily Express са спасылкай на даследаванне спецыялістаў брытанскай Службы нацыянальнай статыстыкі. У 2014 годзе 6649 нованароджаных хлопчыкаў назвалі Оліверам, а 5327 дзяўчынак — Амеліямі. Імя Мухамед (Махамед або Мухамад) атрымалі 7240 немаўлятаў, якія нарадзіліся ў 2014 годзе.

### Колькасць ахвяр спякоты ў Егіпце перавысіла 100 чалавек

Пра гэта паведаміла Міністэрства аховы здароўя Егіпта. З пачатку мінулага тыдня зарэгістравана 105 смяротных выпадкаў у выніку цеплавых удараў. Увогуле ў медыцынскія ўстановы па ўсёй краіне былі дастаўлены 2395 чалавек, амаль тысяча застаецца пад наглядам медыкаў. У апошнія дні слупок тэрмометра ў большасці егіпецкіх рэгіёнаў не апускаецца ніжэй за 40 градусаў, а ў паўднёвых правінцыях краіны тэмпература паветра часта перавышае 50 градусаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Марадона папрасіў прабачэння ў суддзі за забіты рукой мяч

Былы паўабаронца зборнай Аргенціны Дыега Марадона папрасіў прабачэння ў туніскага арбітра Алі Бэн Насэра. На ЧС-1986 у Мехіка суддзя памылкова залічыў першы мяч у вароты зборнай Англіі, які Марадона забіў рукой (паведамляе «El Mundo»). «Прыношу Вам свае прабачэнні, спадар Бэн Насэр, гэты мяч я забіў дзякуючы руцэ Госпада», — сказаў Марадона падчас сустрэчы. У матчы чвэрцьфіналу супраць каманды Англіі Марадона забіў 2 мячы і прынёс перамогу сваёй зборнай.

КАРАТКА

**Гаспадаркі Гомельскай вобласці выканалі пастаўкі жыта і ячменю па дзяржзаказе. Па стане на 18 жніўня на элеватары дастаўлена 57,7 тыс. т жыта і 2,07 тыс. т ячменю, што складае 105% і 104% да плана адпаведна.**

Для маніторынгу прэзідэнцкіх выбараў у краіне акрэдытавана 516 нацыянальных назіральнікаў.

**Падаць заяўку на крэдыт Беларусбанка ў хуткім часе можна будзе праз інфакіёск.**

Фінал нацыянальнага адборачнага тура дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2015» будзе паказаны 21 жніўня ў 22.00 у прамым эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1» і «Беларусь 24».

**Звыш 6,2 тыс. ветэранаў і інвалідаў атрымалі ў першым паўгоддзі 2015 года дапамогу ў рамонце жылля на Br6,4 млрд.**

Беларус Генадзь Караткевіч заняў першае месца ў конкурсе праграмавання Google. Ён атрымаў $15 тыс. і магчымасць прыняць удзел у фінале Google Code Jam і ў наступным годзе.

■ Насустрач Дню ведаў

# НОВЫЯ ШКОЛЫ І ПРОФІЛЬНАЕ НАВУЧАННЕ

**Поўным ходам ідзе ў краіне падрыхтоўка да новага навучальнага года. Плануецца, што 1 верасня 2015 года да школьных заняткаў прыступяць амаль 950 тысяч навучэнцаў, у тым ліку за школьныя парты сядуць 106,5 тысячы першакласнікаў. У параўнанні з 2014/2015 навучальным годам агульная колькасць навучэнцаў павялічыцца на 19 тысяч чалавек.**

Чакаюць сваіх вучняў і тры новыя школы. Так, у Пінску ў мікрараёне «Вясёлкавы» адчыніць дзверы сярэдняя школа, разлічаная на 1020 месцаў. У Гродне ў мікрараёне «Вішнявец-7» узведзена школа на 765 месцаў. А ў сталічным мікрараёне «Лебядзіны» адкрыецца школа на 1020 вучняў. Дзень ведаў распачнецца ва ўсіх школах з правядзення ўрока на тэму «На цябе, наша моладзь, надзея!». Тэма першага ўрока абрана невыпадкова. 2015 год аб'яўлены ў Беларусі Годам моладзі.

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

З 2015/2016 навучальнага года ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі распачынаецца пераход на адносную завершанасць II ступені агульнай сярэдняй адукацыі і ўводзіцца профільнае навучанне на старшай ступені школы. Змены закрануць найбольш вучняў пятых і дзясятых класаў.

Ужо зацверджаны новы тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі, скарэктаваны навучальныя праграмы па вучэбных прадметах для вучняў 1, 5 і 10 класаў, прычым для 10 класа распрацаваны навучальныя праграмы з улікам двух узроўняў вывучэння прадметаў — базавага і павышанага. У пятых класах уведзены навучальны прадмет «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)».

У рамках профільнага навучання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі будуць адкрыты педагагічныя классы. Іх вучні таксама будуць вывучаць тыя ці іншыя школьныя дысцыпліны на павышаным узроўні. Як правіла, гэта тыя прадметы, настаўнікамі якіх яны плануюць стаць у будучыні. Акрамя гэтага, навучэнцы педагагічных класаў павінны будуць абавязкова засвоіць праграму факультатыўнага занятку «Уводзіны ў педагагічную прафесію».

Дарэчы, 15 жніўня працаваць ва ўстановах адукацыі пачнуць 5036 маладых спецыялістаў. Такім чынам, установы адукацыі будуць цалкам забяспечаны кадрамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ISSN 1990 - 763X




■ Узровень

# ВЫДАТНІКІ Ў СВАЁЙ ПРАФЕСІІ

**Першую спробу беларусаў скарыць Алімп прафесійнага майстэрства на сусветным чэмпіянаце WorldSkills-2015 нельга назваць няўдалай: з Бразіліі беларуская каманда прывезла два медалі выдатнікаў.**

*Спаборніцтвы WorldSkills-2015 праходзілі ў Сан-Паўлу ў канцэртна-забаўляльным комплексе Park Anhembi агульнай плошчай 213 тысяч кв.м. На чэмпіянат прыехалі 1192 канкурсанты з 59 краін і 1144 эксперты з 70 краін. Ім дапамагалі 300 перакладчыкаў і 800 валанцёраў.*

Наша краіна ўступіла ў міжнародную асацыяцыю WorldSkills толькі ў студзені 2014 года і тут жа пачала рыхтавацца спачатку да нацыянальнага, а потым і да сусветнага чэмпіянату. На апошнім беларуская зборная ў складзе 17 чалавек спаборнічала ў 15 кампетэнцыях (аўтамабільныя тэхналогіі, мехатроніка, фрэзерныя і токарныя працы на станках з праграмным кіраваннем, мабільная робататэхніка, электроніка, кабельная сістэма інфармацыйнай сеткі, цырульніцкае мастацтва, рэстаранны сэрвіс і іншых). Усе канкурсанты выступілі вельмі годна, але больш вопытныя сапернікі аказаліся мацнейшымі. Пры гэтым усе ўдзельнікі чэмпіянату, якія набралі 500 і больш балаў, але не былі ўзнагароджаны залатым, сярэбраным або бронзавым медалямі, атрымалі медалі выдатнікаў. Сярод беларусаў такія медалі атрымалі **Алеся НАЗАРАВА, якая дэманстравала сваё прафесійнае майстэрства ў кампетэнцыі «Цырульніцкае мастацтва» (516 балаў), і Вольга ЗАКРЭЎСКАЯ — у кампетэнцыі «Дызайн адзення» (515).** Таксама Алесі Назаравай уручылі медаль «Best of nation», які даюць аднаму канкурсанту ад кожнай краіны, які набраў найбольшую колькасць балаў сярод сяброў па камандзе.

Яшчэ адзін медаль быў уручаны **тэхнічнаму дэлегату WorldSkills Беларусь Вользе ДЗЕХЦЯРЭНЦЫ,** якая выступала ў ролі прэзідэнта журы ў кампетэнцыі «Візуальны мерчандайзінг».

У дні правядзення сусветнага чэмпіянату ў Бразіліі прайшла Міжнародная канферэнцыя міністраў адукацыі «Ініцыятывы XXI стагоддзя, накіраваныя на садзейнічанне прафесійнай адукацыі і навучанню», якую наведаў **міністр адукацыі Беларусі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.** У рамках свайго візіту кіраўнік сістэмы адукацыі правёў перамовы са старшынёй WorldSkills International Сайманам Бартлі і сустрэўся з міністрам адукацыі Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія, з якім падпісаў Пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі. Да гэтага часу ў нас з Бразіліяй такога дагавора не было. У дакументе адзначана, што бакі будуць садзейнічаць усталяванню і развіццю прамых сувязяў паміж установамі адукацыі дзвюх краін.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# ПУСТЫЯ ВЁСКІ І СТАРЫЯ ДАМЫ: ліквідаваць адназначна

**На Міншчыне да канца года плануецца знесці 1405 старых і пустых дамоў у сельскай мясцовасці. У першым квартале знесена 300, у другім — 491. У севазварот уведзена 339 участкаў. Усяго ж на гэтыя мэты выдзелена 2 млрд 408 млн рублёў. Добраўпарадкаванне не спыняецца нават зімой. Аб тым, што яшчэ трэба зрабіць, каб паселішчы цэнтральнага рэгіёна, вобразна кажучы, зазіхацелі, распавёў старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ.**

***— Іван Эдуардавіч, ведаю, што ў Мінскай вобласці актыўна зносяцца старыя і пустыя дамы, а зямельныя ўчасткі пасля рэкультывацыі ўцягваюцца ў сельскагаспадарчы абарот або аддаюцца людзям. Скажыце, калі ласка, шмат яшчэ засталося свабодных для выкарыстання надзелаў?***

— У Мінскай вобласці налічваецца больш як 5200 вёсак. У кожнай з іх ёсць, як мінімум 10—15 участкаў, гатовых для выкарыстання. Да іх падведзены электрычнасць (на некаторых ёсць шахтавы калодзеж), да іншых — цэнтралізаванае водазабеспячэнне, газ. З улікам таго, што ў нас у сярэднім у кожным населеным пункце 10 свабодных надзелаў, то больш як 52 тысячы іх чакаюць сваіх гаспадароў. Усе ахвотныя могуць звярнуцца ў сельскія Саветы з заявай на выкарыстанне гэтай зямлі. А спадчыннікам, якім дасталася маёмасць ад бацькоў, сваякоў, трэба вызначыцца з ёй, прывесці ў належны выгляд дом, гаспадарчыя пабудовы, участак і ў далейшым падтрымліваць там парадак, каб не псаваць агульны выгляд населенага пункта, вуліцы. Калі сядзіба недагледжана, запушчана, заросла кустоўем, пустазеллем, мы будзем зносіць дом у любым выпадку.

Некаторыя кіраўнікі сельгаспадпрыемстваў будуюць на вызваленых надзелах новыя дамы для сваіх работнікаў, спецыялістаў. Калі ўчасткі незапатрабаваны, з чым сутыкаюцца, напрыклад, у Любані, Старых Дарогах, Клецку, то землі прыцягваюць у севазварот. А пры наяўнасці ахвотных аддаюцца ім для пасадкі бульбы, іншай гародніны.

***— Іван Эдуардавіч, для зносу старых і пустых дамоў выдзяляюцца сродкі як з раённага, так і з абласнога бюджэту. Ці хапае іх?***

— Бясспрэчна, іх недастаткова. Таму сельскія Саветы сумесна з сельгаспадпрыемствамі па дагаворы дапамагаюць прыводзіць у парадак сядзібу, участак. Для гэтага выдзяляюць сваю тэхніку, рабочых. Напрыклад, пасля зносу пабудоў драўляныя рэшткі ідуць на ацяпленне механічных майстэрняў, зернесушыльнай гаспадаркі. Для зносу аднаго дома ды расчысткі ўчастка неабходна 3-3,5—4 млн рублёў. Але ў некаторых выпадках, калі дом і гаспадарчыя пабудовы вялікія, кошт работ даходзіць і да 10 млн рублёў.

Дадам, што на Міншчыне, зрэшты як і ў краіне, з кожным годам змяншаецца колькасць насельніцтва ў сельскай мясцовасці. У нас з 5200 вёсак больш як у 80 ніхто не жыве і не зарэгістраваны. І цяпер стаіць задача па іх скасаванні. Раённыя Саветы на сваіх сесіях маюць права разглядаць гэтыя пытанні.

Наогул жа працэс навядзення парадку на зямлі пастаянны. Нам неабходна ўдыхнуць у вёскі новыя сілы, прыцягнуць новых жыхароў, якія б, калі не пражывалі, то прыязджалі на лета, адпачывалі, садзілі агароды.

Найбольшых поспехаў па навядзенні парадку на зямлі дабіліся Клецкі, Вілейскі, Дзяржынскі раёны, а старшыні райвыканкамаў адзначаны Ганаровай граматай Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. І ў далейшым будзем заахвочваць кіраўніцтва раёнаў у гэтым напрамку.

***— На маю думку, наводзіць парадак на зямлі ў сельскай мясцовасці дапамагае і такая форма работы з насельніцтвам, як правядзенне свята вёсак. Ці не так, Іван Эдуардавіч?***

— Сапраўды, з мінулага года ў Мінскай вобласці сур'ёзна пастаўлена пытанне па правядзенні свят вёсак. Штомесяц у кожным раёне павінна праходзіць адно вялікае свята. Яно як бы завяршальны акорд таго, што зроблена папярэдне. А робіцца нямала: добраўпарадкуецца як сам населены пункт, падворкі, так і наваколле: на палях, лугах, малочнатаварных фермах. Да работы падключаюцца ўсе раённыя арганізацыі, кожная з іх адказвае за свой участак работы, наводзіць «бляск» на ведамасных аб'ектах вытворчай, сацыяльнай, культурнай сферы.

Па-другое, такія святы збіраюць выхадцаў з гэтых мясцін, у тым ліку з блізкага і далёкага замежжа. Яны прыязджаюць са сваімі дзецьмі, унукамі. І наша задача паказаць ім, што Беларусь, іх малая радзіма, жыве, квітнее. Магчыма, хтосьці з іх захоча вярнуцца ў родныя мясціны.

Акрамя таго, кожнаму сельсавету вызначылі праводзіць свята вёскі штомесяц на сваёй тэрыторыі. Але ўжо сіламі самі жыхароў. Работнікі сельскіх Саветаў абыходзяць падворкі, гутараць з гаспадарамі, глядзяць, што тут трэба зрабіць, дзе абкасіць, дзе падрамантаваць ці пафарбаваць агароджу. Дарэчы, за першае паўгоддзе праведзены 164 святы вёсак. А гэта значыць, 164 населеныя пункты сталі прывабней, чысцей, прыгажэй.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**
*lazovskaya@zviazda.by*

## ЗАПЫТАЙЦЕСЯ — І ВАМ АДКАЖУЦЬ!

### Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 22 жніўня прамыя тэлефонныя лініі

Такая сувязь доўжыцца з зімы гэтага года і, як паказвае практыка, вельмі папулярная сярод жыхароў нашай краіны. Штотыднёвае правядзенне прамых тэлефонных ліній створана з мэтай павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

**У ГЭТУЮ СУБОТУ НА СУВЯЗЬ З БЕЛАРУСАМІ ВЫЙДУЦЬ:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
старшыня ЛІС Анатоль Васільевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў АЦЯСАЎ Аляксандр Ягоравіч (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ШУЛЕЙКА Юрый Вітольдавіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васільевіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
кіраўнік спраў КОТАЎ Мікалай Аляксандравіч (80172224444).

## ПІНЖАК З ТЭРМОМЕТРАМ ДЫ КІШЭНЯМІ ДЛЯ МАБІЛЬНІКА

### Сабрацца ў школу дапаможа «Славянка»

**Падчас выязнога прэс-мерапрыемства прадстаўнікі Мінгандлю, Мінадукацыі і канцэрна «Беллегпрам» наведалі буйнога бабруйскага вытворцу школьнага адзення.**

Гэтае прадпрыемства вядома сваімі наватарскімі і крэатыўнымі падыходамі да справы. Менавіта тут некалькі гадоў таму ўпершыню пачалі прапаноўваць школьныя пінжакі з унутранымі тэрмометрамі з сілікону, каб адсочваць самаадчуванне вучня. Не менш эксклюзіўнымі з'яўляюцца мадэлі з кішэнямі для мабільнікаў са спецыяльнага матэрыялу, які экраніруе шкоднае электрамагнітнае выпраменьванне. Кожны год асартымент тутэйшага вытворцы абнаўляецца. І зараз ён прадэманстраваў 40 новых мадэляў школьнай формы. Дарэчы, прадпрыемства паставіла ў гэтым годзе на ўнутраны рынак каля 170 тысяч адзінак адзення дзелавога стылю для хлопчыкаў і 51 тысячу адзінак — для дзяўчынак.

Наогул, як адзначалася падчас мерапрыемства, і вытворцы, і гандаль у Беларусі гатовы прыгожа і зручна апрануць любога вучня.

— У гандлёвых арганізацыях прадстаўлены годны асартымент не толькі канцэрна «Беллегпрам», але і 4 тысяч вытворцаў-швейнікаў, якія выпускаюць розную вопратку для школьнікаў, — паведаміў **намеснік міністра гандлю Вячаслаў ДРАГУН.**

Рэалізацыю тавараў школьнага асартыменту ў Беларусі ажыццяўляюць звыш 6,6 тысячы рознічных гандлёвых аб'ектаў. Пакупнікам прапануецца каля 80 мадэляў трыкатажных вырабаў, каля 200 мадэляў абутку, прыкладна 170 мадэляў ранцаў і рукзакоў. Спецыяльна для заняткаў фізкультурай і спортам вырабляецца каля 40 мадэляў абутку і 50 мадэляў трыкатажных вырабаў. Каб уся гэтая прадукцыя своечасова дайшла да пакупніка, гандлёвыя арганізацыі краіны збіраюцца правесці да навучальнага года звыш 2,2 тысячы выстаў-продажаў. Для паскоранага абслугоўвання пакупнікоў у крамах адкрыта каля 250 дадатковых гандлёвых месцаў, афармлена больш за 5 тысяч куткоў для першакласнікаў і вучняў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ

**ДОБРАЯ НАВІНА**

## НАЙЛЕПШАМУ І «СЛЯПАЯ ДЭГУСТАЦЫЯ» — НЕ ПЕРАШКОДА

### Піваравы з Ліды атрымалі тры медалі ў Лондане

**Прадукцыя прадпрыемства «Лідскае піва» атрымала іх на 19-м міжнародным конкурсе International Beer Challenge 2015. Koronet, «Лідскае Аксамітнае» і «Лідскае Класічнае» былі адзначаны журы з Вялікабрытаніі бронзавымі медалямі.**

У конкурсе ўдзельнічала рэкордная колькасць канкурсантаў: больш за 630 гатункаў піва з 30 краін свету. International Beer Challenge 2015 праводзіўся па наступных катэгорыях: «элі», «лагеры», «стаўты і портэры», «пшанічнае піва», «спецыяльнае піва». Ацэнка ўзораў праходзіла ў два этапы метадам «сляпой дэгустацыі». Узначальваў журы эксперт у галіне сусветнага піваварэння Джэф Эванс.

На прадпрыемстве вельмі ганарацца тым, што другі год запар іх прадукцыю высока ацэньваюць на найбуйнейшым міжнародным конкурсе ў Лондане. Цёмнае піва «Лідскае Аксамітнае» і лагер Koronet узнагароджаны «бронзай» на конкурсе паўторна. А вось «Лідскае Класічнае», тэхналогія прыгатавання якога сёлета максімальна набліжана да традыцыйнай еўрапейскай і адпавядае найстарэйшаму «Баварскаму закону аб чысціні піва», упершыню адзначана бронзавым медалём экспертамі ў піўной справе з Вялікабрытаніі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ПАДАРУНАК ДА ДНЯ ГОРАДА

### У Мінску адновіць працу 23-я паліклініка

**Жыхары Ленінскага раёна сталіцы з нецярпеннем чакаюць пачатку верасня. У перадсвяточныя дні тут адновіць абслугоўванне жыхароў 23-я гарадская паліклініка, размешчаная па адрасе: праспект Ракасоўскага, 134.**

«Больш за два гады медустанова была зачынена ў сувязі з капітальным рамонтам і мадэрнізацыяй. Замацаваныя за ёй гараджане часова размеркаваны па найбліжэйшых установах аховы здароўя», — паведаміла **намеснік кіраўніка адміністрацыі Ленінскага раёна Галіна ШКОДА.**

У паліклініцы ўстаноўлена сучаснае абсталяванне, якое дазваляе, у прыватнасці, праводзіць ультрагукавое даследаванне сэрца і сасудаў, малыя хірургічныя аперацыі ў жаночай кансультацыі і траўма-хірургічным аддзяленні, фізіятэрапеўтычныя працэдуры, лічбавы рэнтген, гразелячэнне. Штат укамплектаваны неабходнымі спецыялістамі. Плануецца, што ў 23-й паліклініцы будзе абслугоўвацца каля 36 тысяч чалавек.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

## ФАТАЛЬНАЕ СЭЛФІ

**У рэанімацыі аказалася 13-гадовая дзяўчынка з Пружанскага раёна пасля няўдалай спробы зрабіць сэлфі.**

Школьніца з сяброўкай гулялі на чыгуначнай станцыі Аранчыцы. Яна пажадала зрабіць здымак на вышыні і залезла на грузавы вагон. Апошні знаходзіўся пад высакавольтнай лініяй электрапередач. І дзяўчынку ўдарыла токам. Сяброўка выклікала хуткую дапамогу.

Як паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага УУС, школьніцу з дыягназам — электратраўма і множныя апёкі паверхні цела — даставілі ў бальніцу. Трагедыя адбылася ў нядзелю вечарам, у першай палове дня ў панядзелак дзяўчынка ўсё яшчэ знаходзілася без прытомнасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## «СТОП — НЯПРАВІЛЬНЫ КРОК!»

**Пад такой назвай 22 жніўня Беларуская чыгунка правядзе акцыю, скіраваную на захаванне правіл паводзінаў пры знаходжанні на чыгуначных пуцях.**

Мерапрыемства магістраль ладзіць сумесна з галіновым камітэтам БРСМ і аддзеламі ўнутраных спраў на транспарце Міністэрства ўнутраных спраў. Яно скіравана на зніжэнне колькасці парушэнняў правіл пераходу чыгуначных пуцей ва неўстаноўленых месцах і звязаных з гэтым выпадкаў траўматызму, а таксама на прафілактыку правапарушэнняў сярод непаўналетніх.

Акцыя пройдзе 22 жніўня з 11 да 14 гадзін больш чым на 110 станцыях Беларускай чыгункі, пра што паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Захаванне правіл бяспечных паводзінаў будуць кантраляваць сумесныя групы, у склад якіх увойдуць чыгуначнікі і міліцыянеры.

**КРЫХУ СТАТЫСТЫКІ**

Нягледзячы на штогадовую тэндэнцыю да зніжэння, колькасць не звязаных з вытворчасцю выпадкаў траўматызму працягвае заставацца высокай. З пачатку года на чыгунцы пацярпелі 93 чалавекі, 56 з іх — загнулі (гэта менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, калі траўмы атрымалі 112 чалавек і 73 загінулі). У тым ліку траўміравана чацвёра непаўналетніх.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДОМ ДЛЯ НОВАЙ СЯМ'І

**Днямі ў Пінску адкрылі яшчэ адзін дом сямейнага тыпу. У двухпавярховы катэдж па вуліцы Гранічнай засялілася сям'я Кацярыны і Эдуарда Шыкеляў. Да нядаўняга часу бацькі выхоўвалі траіх уласных дзяцей. А зараз сям'я папоўнілася яшчэ чатырма дзяўчынкамі, былымі выхаванцамі дзіцячых устаноў.**

Бацькоў і іх сямёра дзяцей прыйшлі павіншаваць з навасellем і днём народзінаў новай сям'і кіраўнікі гарадской улады, прадстаўнікі грамадскасці, супрацоўнікі органаў адукацыі, спонсары. Былі і падарункі, і сімвалічнае перарэзанне стужачкі, кветкі, усмешкі. Усе пажадалі Кацярыне і Эдуарду поспехаў у нялёгкай бацькоўскай працы, а дзецям цеплыні і шчасця ў новай сям'і.

**Начальнік упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама Міхаіл ЦІХАНЧУК** разам з віншаваннямі адзначыў, што на Брэстчыне сёння функцыянуе 39 дамоў сямейнага тыпу, у якіх выхоўваюцца 260 дзяцей. І работа па стварэнні такіх устаноў працягваецца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

■ Погляд

# Устойлівыя інструменты развіцця

## дапамогуць нашай эканоміцы стаць больш эфектыўнай

**Адным з асноўных пытанняў для кіраўніцтва любой дзяржавы з'яўляюцца праблемы эканамічнага росту і забеспячэння дабрабыту насельніцтва. Рэспубліка Беларусь таксама не з'яўляецца выключэннем з гэтага правіла. Неаднаразова ў такім ключы арыентаваў айчынных чыноўнікаў і Прэзідэнт нашай краіны Аляксандр Лукашэнка. «Наша палітыка — гэта эканоміка», — менавіта так лічыць кіраўнік дзяржавы.**

### ЦІ ЁСЦЬ У НАС «САЦЫЯЛЬНЫ КАНТРАКТ»?

Вядома, такая формула з'яўляецца вельмі спрошчанай праграмай развіцця Беларусі, але і айчынныя, і замежныя палітычныя аглядальнікі адзначаюць, што аснову існавання беларускай суверэннай мадэлі складае так званы «сацыяльны кантракт». Сапраўды, на афіцыйным узроўні дэкларуецца: Беларусь — гэта сацыяльна арыентаваная краіна, што прадугледжвае апеку дзяржавы над неабароненымі катэгорыямі насельніцтва, магчымасці для развіцця і дабрабыту для ўсіх людзей працаздольнага ўзросту.

Між тым, крытыкі беларускага ўрада на працягу многіх гадоў вінавацяць кіраўніцтва дзяржавы зусім у адваротным: згодна з іх сцвярджэннямі, насельніцтва паступова бяднее, тэмпы інфляцыі павялічваюцца, спажывецкія магчымасці змяншаюцца. У доказ сваіх слоў апаненты дзеючай улады прыводзяць розныя «рэйтынгі», паказчыкі знешняга доўгу, графікі тэмпаў прамысловай вытворчасці...

Добрай глебай для такой прапаганды і распаўсюджвання панічных настрояў з'яўляецца сітуацыя, што склалася на знешніх рынках Беларусі: з 2008 года ў свеце пануе глабальны эканамічны крызіс, у сувязі з абвалам цаны на нафту падае эканоміка Расіі, а на поўдзень ад беларускай мяжы, ва Украіне, ідзе грамадзянская вайна. Такая кан'юнктура, вядома, адбіваецца на стане беларускай эканомікі. Не маючы значных запасаў прыродных рэсурсаў, айчынная мадэль развіцця з'яўляецца цалкам індустрыяльнай і экспартна арыентаванай, таму Беларусь моцна залежыць ад любых эканамічных хваляванняў па-за сваімі межамі.

Трэба прызнаць, што за апошнія сем гадоў урад тройчы быў вымушаны пайсці на дэвальвацыю беларускага рубля, але абясцэненне нацыянальнай валюты з'яўляецца адным з інструментаў стымуляцыі экспарту і відавочна праводзілася зыходзячы з інтарэсаў абароны нашых вытворцаў. Пры гэтым у любога аб'ектыўнага назіральніка ўзнікаюць лагічныя пытанні: «А як жа насельніцтва? Хто паклапаціўся пра людзей, што страцілі прыбыткі? Як гэта вяжацца з сацыяльным вобразам беларускай дзяржавы?» Такім чынам, існуе патрэба разгледзець шэраг сацыяльна-эканамічных паказчыкаў у дынаміцы ды параўнаць становішча ў Беларусі з некаторымі іншымі краінамі.

### НЯЎМОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ СТАТЫСТЫКІ

Вядома, што ў 1991 годзе наша краіна перажыла найбуйнейшую ў гісторыі геапалітычную катастрофу — распад Савецкага Саюза. Суверэнная Беларусь адначасова пазбавілася апекі з боку саюзнага цэнтра, дзяржаўнага заказу на прадукцыю, а традыцыйныя сувязі прамысловай кааперацыі аказаліся пад пагрозай разрыву. Фактычна, ад былой імперыі беднай на сыравінныя рэсурсы Беларусі застаўся комплекс буйных прамысловых актываў, дзе былі заняты мільёны чалавек. На той час увогуле было невядома, ці патрэбна беларуская прадукцыя новым савецкім рэспублікам, ці здольны беларусы канкураваць з заходнімі і азіяцкімі вытворцамі. Таксама незразумела было, хто заменіць былых савецкіх партнёраў для беларускай прамысловасці ў ланцугу індустрыяльнага супрацоўніцтва. У той жа час у суседніх Расіі і Украіне прамысловыя актывы згаралі як свечкі, паралельна з чым у асобных камерсантаў узнікалі шматмільярдныя прыбыткі, а ў лексіку былога савецкага чалавека стала ўвайшло слова «алігарх». «Ліхія 90-я» зараз ужо забыліся, аднак некаторым крытыкам беларускай палітыкі карысна будзе нагадаць вопыт украінскіх ці расійскіх рэфарматараў, калі людзі месяцамі, а то і гадамі не атрымлівалі заробкаў і пенсій альбо тыя заробкі выдаваліся панчохамі, посудам і г.д.

Паказчыкам эфектыўнасці дзяржаўнай эканамічнай палітыкі беларускага ўрада стаў той факт, што рэальныя прыбыткі насельніцтва на сёння больш чым у тры разы пераўзыходзяць узровень дакрызіснага 1990 года: заробкі ў 3,2 раза, сярэдні памер прызначаных пенсій — у 3 разы. Пры гэтым нагадаем, што, нягледзячы на надзвычай цяжкія ўмовы для развіцця, беларуская дзяржава ніколі не адмаўлялася ад сваіх абавязкаў перад насельніцтвам: да гэтага часу ў нашай краіне захавана бясплатная адукацыя, медыцына, з бюджэту кампенсуецца 60% кошту камунальных паслуг.

Натуральна, Беларусь не змагла цалкам пазбегнуць наступстваў развалу Савецкага Саюза. З 1991 па 1994 год, да першых прэзідэнцкіх выбараў, у нашай краіне ў той ці іншай ступені фіксаваліся ўсе негатыўныя праявы «дзікага капіталізму». Дастаткова адзначыць, што толькі ў жніўні 1994 года тэмпы інфляцыі склалі 53, 4%, а больш за 50% насельніцтва мелі прыбыткі, ніжэйшыя за пражытачны мінімум.

Такім чынам, новаабранае кіраўніцтва дзяржавы на чале з Аляксандрам Лукашэнкам апынулася тады ва ўмовах, яшчэ больш жорсткіх, чым у 1991-м, і нездарма першая прэзідэнцкая праграма называлася: «Адвесці краіну ад прорвы». Калі ў 1991 годзе толькі склалася пагроза заняпаду дзяржавы, то ў 1994-м працэсы дэградацыі ўжо былі запушчаны на поўную магутнасць. Падаецца, што ні адзін з дасведчаных экспертаў у той час не паставіў бы на тое, што Беларусь захавае сваю прамысловасць, ды і ўвогуле выказваліся сумненні, што ў нашай краіны ёсць будучыня. Тым не менш, прамысловая вытворчасць у параўнанні з 1995 годам не толькі не знікла, але і выраслa ў 3,5 раза, а доля насельніцтва з бюджэтам, ніжэйшым за пражытачны мінімум, скарацілася з 53% да 5,2%.

Яшчэ адным важным паказчыкам з'яўляецца таксама той факт, што ў крачынным лібералам рэформы і ўпэўнена крочаць па шляху «еўрапейскага выбару». Такім чынам, у 2015 годзе сярэдні памер пенсіі ва Украіне склаў 1670 грыўняў (75 долараў), у Малдове — 1100 леяў (58 долараў), а у Грузіі — 150 лары (65 долараў) . Між тым, сярэдні памер пенсіі ў Беларусі 2 мільёны 883 тысячы беларускіх рублёў, што прыблізна складае 180 долараў ЗША. Калі яшчэ дадаць, што ў гэтых краінах цэны на камунальныя паслугі, лекі і медыцыну вышэйшыя за беларускія, то ўсё, як кажуць, стане на свае месцы.

Завяршаючы тэму дабрабыту насельніцтва трэба адзначыць, што Беларусь лідзіруе ў СНД па забяспечанасці насельніцтва жыллём (24,7 кв.м на жыхара) і аўтамабілямі (355 аўто на 1000 жыхароў), а медыянны прыбытак беларусаў (5236 долараў у год), згодна з даследаваннямі службы Гэлапа, знаходзіцца на 32-м месцы сярод 131 краіны свету, што вышэй, чым ва ўсіх нашых суседзяў.

### АД ВЫЖЫВАННЯ ДА ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

Натуральна, гэтыя радасныя паказчыкі зусім не здымаюць існуючых праблем, галоўнай з якіх з'яўляецца залежнасць Беларусі ад традыцыйных рынкаў збыту прадукцыі, у першую чаргу расійскага рынку. На жаль, большасць тавараў айчыннай вытворчасці наша краіна экспартуе менавіта ў Расійскую Федэрацыю, на рынках Азіі, Афрыкі і Амерыкі наша прысутнасць пакуль нашмат меншая. Што да рынку Еўрапейскага саюза, то тут Беларусь прадстаўлена ў асноўным прадукцыяй нафтаперапрацоўкі, што робіць айчынную эканоміку залежнай яшчэ і ад хваляванняў цаны на нафту. Трэба сказаць, што такая сукупнасць знешніх фактараў стварае ўстойлівую пагрозу эканамічнаму развіццю Беларусі. Ад пачатку 2000-х гадоў ужо двойчы ў нашай гісторыі былі перыяды калі тэмпы інфляцыі складалі больш за 100% — у 2000 (107,5%) і ў 2011 (108, 7%) гадах. Вядома, такая сітуацыя значна нервуе насельніцтва і падрывае давер да айчыннай мадэлі. Тут варта нагадаць, што заўжды крызіс у Беларусі быў вельмі нядоўгім, а заробкі хутка дасягалі, а пасля і перавышалі дакрызісны ўзровень. У нестабільныя часы палітыка беларускага ўрада, у асноўным, была эфектыўнай.

Такім чынам, і зараз, калі эканоміка краіны перажывае няпросты час з прычыны моцнага крызісу ў Расіі, не варта паддавацца панічным настроям. Беларусі патрэбны ўстойлівыя інструменты развіцця, дзяржава мусіць перайсці ад перманентнага выжывання ў эканоміцы на сталыя рэйкі, таму трэба пачакаць, пакуль свой эфект дадуць запушчаныя праграмы мадэрнізацыі прамысловасці, праекты еўразійскай інтэграцыі і маштабныя дамоўленасці па эканамічным супрацоўніцтве з Кітаем.

Падаецца, што яшчэ ў 1994 годзе народ выпісаў дзеючай уладзе крэдыт даверу, гэты давер быў апраўданы, а крэдыт яшчэ не вычарпаны да канца. Іншымі словамі, сапраўдныя дасягненні маладой Беларусі яшчэ наперадзе.

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ, дырэктар інфармацыйна-асветніцкай установы «Актуальная канцэпцыя»**

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 7 (47)



■ Гарачы рэпартаж

# ХЛЕБАРОБЫ Ў ПАГОНАХ

## Збіраць ураджай дапамагаюць і салдаты

**Спякотны жнівеньскі дзень. Вайскоўцы выехалі ў поле. Праўда, на гэты раз не для таго, каб прайсці артылерыйскую падрыхтоўку або засвоіць танкавае майстэрства. У разгары — жніво.**

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Для сяржанта Эдуарда ЛАВІЦКАГА ўдзельнічаць ва ўборцы жніва — вельмі пачэсна.

Каб пераканацца ў тым, што вайскоўцы спраўляюцца з даручанай справай, карэспандэнты «Звязды» выехалі ў Пухавіцкі раён. У вёску Суцін прыбылі самай раніцай. Толькі ад гарадской спёкі так і не ўдалося ўцячы. Тут, на сенажаці, прыпякала яшчэ больш.

— Нас спёка не палохае, — быццам прачытаў мае думкі сяржант Мікіта Фаменка. — Наша падраздзяленне гатовае да ўсяго: і сувязь наладжваць, і ўраджай збіраць!

У адкрытае акцыянернае таварыства «Суцінскі» вайскоўцы прыбылі з 86-й брыгады сувязі, што дыслакуецца ў Калодзішчах. Іх — чацвёра. А гэтага дастаткова, каб забяспечыць перавозку сабранага зерня. Працоўных рук у гаспадарцы хапае. А вось у тэхніцы патрэба была. Вырашылі праблему два аўтамабілі, на якіх прыехалі вайскоўцы. Яшчэ адзін на час уборкі даслалі з барысаўскай часці.

Салдаты з 86-й брыгады сувязі кожны год дапамагаюць беларускім аграрыям збіраць ураджай. Толькі ў Суціне яны ўпершыню. Мясцовыя хлебаробы дагэтуль абыходзіліся без дапамогі.

— Вельмі добрасумленны калектыў ваеннаслужачых прыбыў да нас, — пераканаўся **дырэктар прадпрыемства «Суцінскі» Пётр МОХАРАЎ.** — Яны выконваюць усе нашы даручэнні. Прычым робяць усё своечасова. Яны ж людзі ваенныя, таму лепш, чым хто разумеюць, што такое дысцыпліна. Не магу нават успомніць, каб хоць адна заўвага тычылася іх працы. Мы вельмі ўдзячны ваеннаму кіраўніцтву, якое адгукнулася на нашу просьбу.

За суткі хлебаробы ў пагонах перавозяць на зернесушылку каля 50 тон збожжа. Дзеля гэтага кожная з дзвюх машын павінна выканаць па 3-4 рэйсы. Акрамя таго, прыкладна каля 20 тон зерня штодзень адвозіцца на камбінат хлебапрадуктаў у Пухавічы. Адным словам, без працы хлопцы не сядзяць.

Але, як прызнаўся галоўны аграном гаспадаркі, яе магло быць і больш. «Гэты год для нас не вельмі ўраджайны, — гаворыць Генадзь Баешка. — Адбіліся вясенняя маразы, адсутнасць ападкаў...»

Затое падчас жніва з надвор'ем пашанцавала. Праўда, і тут ёсць свае недахопы. У спёку павышаецца пажаранебяспека. Невыпадкова побач з камбайнамі на полі стаяць бочкі з вадой — своеасаблівая «хуткая дапамога». Аляксандр Кургановіч, які дастаўляе на сенажаць каштоўную вадкасць, — ветэран жніва. Яму ўжо 80 гадоў, а ён хоць такім чынам, але дапамагае ва ўборцы ўраджаю.

Камбайнерам увогуле грэх скардзіцца: кабіна ўборачнай тэхнікі абсталявана кандыцыянерам. Хлебаробам там не тое, што горача, а часам холадна бывае. Пераканаліся ў гэтым, калі ўбачылі Андрэя Палазніка, які выйшаў з камбайна на абед у штанах і кашулі з доўгім рукавом.

На абед падышлі і вайскоўцы. Прыгатаваныя стравы ім, як і ўсім хлебаробам гаспадаркі, прывозяць адразу на поле. Двойчы салдаты харчуюцца ў полі, снедаюць у камфартабельным доміку, дзе іх пасялілі.

— Мы сюды прыехалі ўпершыню і вельмі задаволены тым, як да нас ставяцца, — дзеліцца ўражаннямі прапаршчык Кірыл Жогалеў. — Нам усяго хапае. Праўда, спёка вымотвае, але калі-нікалі знаходзім час пакупацца. Для нас вельмі пачэсна прымаць удзел у жніве. Радасна ўсведамляць, што і мы, вайскоўцы, далучыліся да такой важнай справы.

Дарэчы, сёлета беларускім хлебаробам дапамагае больш чым сто ваеннаслужачых, якія працуюць у розных сельскагаспадарчых арганізацыях рэспублікі. У зборы ўраджаю задзейнічана каля 50 адзінак аўтамабільнай тэхнікі. Дзякуючы вайскоўцам ужо перавезена каля 10 тон збожжа і сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*
*Пухавіцкі раён*

■ Баявая падрыхтоўка

## ВУЧЭННЕ ВОІНСКІХ КАНТЫНГЕНТАЎ

**Беларускія вайскоўцы рыхтуюцца прыняць удзел у сумесным вучэнні з воінскімі кантынгентамі і фарміраваннямі сіл спецыяльнага прызначэння калектыўных сіл аператыўнага рэагавання АДКБ «Узаемадзеянне-2015», якое пройдзе з 22 па 28 жніўня. Упершыню вучэнне адбудзецца ў Пскоўскай вобласці — на базе аднаго са злучэнняў паветрана-дэсантных войск Узброеных Сіл Расійскай Федэрацыі.**

Акрамя падраздзяленняў Узброеных Сіл Беларусі, у вучэнні будуць задзейнічаны нацыянальныя воінскія кантынгенты ўзброеных сіл Расіі, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана і Таджыкістана. Кіраваць манеўрамі будзе камандуючы паветрана-дэсантнымі войскамі Узброеных Сіл Расіі генерал-палкоўнік Уладзімір Шаманаў.

Нагадаем, падобнае вучэнне праводзіцца штогод, пачынаючы з 2009-га, на тэрыторыі адной з дзяржаў — членаў АДКБ. На тэрыторыі Беларусі яно адбывалася два гады таму. Тады аператыўныя групы і вайсковыя кантынгенты ўзброеных сіл Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана адпрацоўвалі адзін з магчымых варыянтаў узнікнення крызіснай сітуацыі ў адной з дзяржаў — удзельніц АДКБ

■ Узаемадзеянне

# НАШЫ Ў ПЕКІНЕ

**Яшчэ нядаўна, на ваенным парадзе 9 Мая, па мінскім праспекце праехалі самыя дарагія ў гісторыі Кітая лімузіны, як неўзабаве ў парадным разліку па сталіцы Паднябеснай пройдуць беларускія вайскоўцы. Прадстаўнікі адной з самых элітных воінскіх часцей Узброеных Сіл Беларусі накіраваліся ў Пекін, каб 3 верасня паўдзельнічаць у ваенным парадзе, які адбудзецца з нагоды 70-годдзя Перамогі ў Другой сусветнай вайне.**

Да знакавай падзеі вайскоўцы роты ганаровай варты рыхтаваліся не адзін дзень. Зараз іх чакаюць інтэнсіўныя трэніроўкі разам з кітайскімі калегамі. Адказнасць — вялікая. Усё-такі гэта першы парад такога ўзроўню: будзе задзейнічана бранятэхніка, ракетныя комплексы, у якасці гасцей у Кітаі чакаюць кіраўнікоў дзяржаў. Аднак выступаць перад такімі важнымі гледачамі, як і ўвогуле прадстаўляць нашы Узброеныя Сілы на міжнародным узроўні, беларускім вайскоўцам не ўпершыню.

— Усе адказна прайшлі падрыхтоўку да гэтага мерапрыемства, — расказаў напярэдадні ад'езду **камандзір зводнай роты ганаровай варты Павел ШПАРЛА.** — Мы рыхтаваліся каля двух месяцаў. Былі штодзённыя трэніроўкі ў любое надвор'е, у розных умовах. Мы прагледзелі шмат відэаматэрыялаў, каб бачыць непасрэдна ўмовы правядзення парада, як выконваюць страявыя прыёмы ваеннаслужачыя кітайскай арміі. І, у прынцыпе, гатовыя да выканання пастаўленай задачы.

Супрацоўніцтва паміж Узброенымі Сіламі Беларусі і Кітая доўжыцца ўжо на працягу больш чым 20 гадоў. А пачыналася ўсё з абмену вопытам у вытворчасці шасі для цяжкіх ракет. Сёння ў гэтым кірунку працуе адразу некалькі сумесных прадпрыемстваў, а спіс двухбаковых праектаў у дзясятку разоў павялічыўся. Вялікае значэнне мае і супрацоўніцтва ў гуманітарнай галіне. Беларускі бок з вялікай удзячнасцю адносіцца да дапамогі, якая бязвыплатна прадастаўляецца кітайскай арміяй.

Як адзначыў **статс-сакратар, памочнік міністра абароны Беларусі па пытаннях ваеннай палітыкі Алег ВОІНАЎ,** удзел беларускіх ваеннаслужачых у парадзе ў Пекіне адкрые шырокія перспектывы ваеннага супрацоўніцтва армій дзвюх краін. «Ужо не першы год мы супрацоўнічаем у многіх сферах, — падкрэсліў генерал-маёр. — Так, сёлета на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь прайшла сумесная беларуска-кітайская антытэрарыстычная трэніроўка «Імклівы арол — 2015», якая дазволіла абмяняцца вопытам, правесці зладжванне беларускіх і кітайскіх падраздзяленняў, стварыць фундамент для далейшага развіцця беларуска-кітайскіх адносін у галіне сумеснай падрыхтоўкі войск».

**Вераніка КАНЮТА**

■ На вышыні

# ВЕРХАМ НА АЎТАЖЫРЫ

## Як пагранічнікі асвойваюць сучасны лятальны апарат

**Калі мы ехалі да пагранічнікаў, каб паназіраць за тым, як яны асвойваюць новы лятальны апарат, што неўзабаве паступіць на ўзбраенне беларускай арміі, нават уявіць не маглі, што станем не проста сведкамі, а ўдзельнікамі сапраўды гістарычнай падзеі.**
**Можа, мы і перабольшваем, але тое, што нам першымі з прадстаўнікоў айчынных медыя пашчасціла апрабаваць гіраплан «Calidus», ці, як яго ў народзе называюць, аўтажыр, — дакладна!**

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Лётчык-метадыст Цэнтра спецыяльнай падрыхтоўкі Рыгор АГАБАБАЎ і карэспандэнт «Звязды» гатовы да палёту.

Я сяжу ў невялікай кабіне на заднім крэсле. Насупраць — пілот. Мяне прышпільваюць рамянямі бяспекі, нацягваюць на галаву навушнікі з мікрафонам — і кабіна зачыняецца. «Узлятайце!» — чуецца каманда. І амаль бясшумна гіраплан, які вельмі нагадвае верталёт, толькі ў паменшаным памеры, узлятае...

Страх, які авалодаў мною яшчэ некалькі хвілін таму, адразу знікае. Зараз — зусім іншыя пачуцці. Перад вачыма паўстаюць беларускія краявіды, і так хораша становіцца ад убачанага. Паветраны карабель пралятае над палеткамі, лясамі, вёскамі... І не адразу ўсведамляеш, што ў пілота, які сядзіць побач, зусім іншыя думкі. Пагранічнік кантралюе становішча, праводзіць разведку тэрыторыі — нясе службу па ахове дзяржаўнай мяжы. Дакладней, будзе рабіць гэта пазней. А пакуль вучыцца, асвойвае новую тэхніку.

— Не страшна? — пранізвае цішыню пытанне пілота.

— Нікольк! — крычу ў мікрафон і заўважаю, што мне нават падабаецца.

— Перад вашым крэслам ёсць ручка кіравання: на некаторы час можаце ўзяць упраўленне гіраплана на сябе, — прапаноўвае лётчык-інструктар.

Тактычна адмовіўшыся, давяраю гэтую справу прафесіяналам. Мы ідзём на другі круг і праз некаторы час зніжаемся... Пасадка настолькі мяккая, што хочацца, як у самалёце, паапладзіраваць. Толькі замест гэтага (бо рукі моцна ўчапіліся за крэсла пілота) кажу ў мікрафон словы падзякі.

Лётчык заўважае, што дарма я не паспрабавала пакіраваць аўтажырам самастойна. Маўляў, нават нявопытны чалавек — што называецца, з нуля — без усялякіх намаганняў можа навучыцца кіраваць сучасным лятальным апаратам. І ў прыклад Рыгор Агабабаў прыводзіць сябе: займаючыся ў аэраклубе, у свой час асвоіў больш чым 50 тыпаў лётнай тэхнікі!

— А чым ад іх адрозніваецца гіраплан «Calidus»?

— Апарат унікальны, — упэўнены старшы інструктар лётчык-метадыст Цэнтра спецыяльнай падрыхтоўкі. — Аўтажыр, нават у параўнанні з верталётам, больш бяспечны. Яму не страшны ні страта хуткасці, ні адказ матора. Пасадка апарата, як з працуючым, так і з выключаным рухавіком, па тэхніцы выканання нічым не адрозніваецца. Калі ж матор адказвае ў самалёта, у найлепшым выпадку гэта пагражае аварыяй. Аўтажыр дазваляе пагасіць і вертыкальную, і гарызантальную хуткасці да нуля. Таму нават у выпадку аварыйнай пасадкі апарат, як правіла, ламаецца, а члены экіпажа застаюцца жывымі. Максімум — з драпінамі.

Гіраплан «Calidus» закупілі ў Германіі ў мінулым годзе. Ужо восенню адбыліся першыя эксперыментальныя палёты. На стадыі завяршэння — закупка яшчэ трох гірапланаў. У перспектыве ў кожным пагранічным атрадзе іх будзе па два.

Гісторыя аўтажыраў пачынаецца з 1920-х гадоў. Шырокае распаўсюджанне гірапланы атрымалі ў 1930-х, пакуль іх нішу не занялі верталёты. Менавіта ад іх верталёты перанялі нясучы вінт, падвялі да яго магутнасць і атрымаўся апарат, які мае магчымасць вертыкальна ўзлятаць і садзіцца. Аўтажыр такой магчымасцю не валодае: ён можа толькі кароткачасова завісаць у паветры. Да выкарыстання апаратаў вярнуліся толькі ў 1970-х гадах.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# КАБ ЗАЎТРА НЕ ПАМЕРЛА НІКОЛІ

**Імя Ефрасінні Савельеўны Зяньковай залатымі літарамі ўпісана ў гісторыю роднай Беларусі. Герой Савецкага Саюза, ганаровы грамадзянін горада Віцебска — яна заслужыла гэтыя званні бескампраміснай барацьбой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Патрыётка згуртавала вакол сябе для сумеснай барацьбы з ворагам такіх жа юнакоў і дзяўчат з найбліжэйшых вёсак у Обальскую падпольную камсамольскую арганізацыю «Юныя мсціўцы», стаўшы яе сакратаром. На рахунку адважных камсамольцаў — дзясяткі дыверсій. Так падпольшчыкі помсцілі фашыстам за сваю параненую зямлю.**

Фруза Зянькова нарадзілася ў вёсцы Ушалы Сіроцінскага (цяпер Шумілінскага) раёна ў сялянскай сям'і. Бацькі яе былі малапісьменнымі, але ўсяляк падтрымлівалі імкненне сваіх дзяцей да вучобы. Брат Мікалай стаў трактарыстам, а Фруза пасля заканчэння сельскай сямігодкі паступіла ў Віцебскую школу ФЗН швейнікаў. Пасля працавала на швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі». У ліку найлепшых работніц была накіравана на вучобу ў швейна-тэкстыльны тэхнікум. Паспела скончыць толькі першы курс, як пачалася вайна. Паспрабавала з групай навучэнцаў прабрацца за лінію фронту, каб стаць байцом Чырвонай Арміі. Але зрабіць гэта не атрымалася. Давялося вяртацца дамоў.

У вёсцы Ушалы Фруза з сяброўкай Валянцінай Шашковай хавалі параненага чырвонаармейца Фёдара Пялюгіна, даглядалі яго. Пра гэта дазналіся фашысты. Байца схапілі, прывязалі да аўтамашыны і волакам прыцягнулі ў Обаль. Пакутніцкая смерць салдата глыбока ўразіла дзяўчат, і яны пакляліся помсціць фашыстам.

У арганізацыю «Юныя мсціўцы» ўвайшлі 38 юнакоў і дзяўчат. Усе яны былі залічаны ў партызанскі атрад імя Варашылава брыгады імя Леніна. Нядаўнія школьнікі, што сталі падпольшчыкамі, забяспечвалі жыхароў навакольных вёсак і станцыі Обаль партызанскімі лістоўкамі. Дзякуючы камсамольцам партызаны ведалі аб размяшчэнні агнявых кропак ворага, перамяшчэнні транспарту па чыгунцы і шашы, аб перадыслакацыі войск. Адважныя мсціўцы амаль кожную ноч здзяйснялі дыверсіі на варожых аб'ектах. Яны спалілі масты на шашы Віцебск — Полацк ля вёсак Ферма і Крупенін, адправілі на той свет зондэр-фюрэра СС і трох афіцэраў, якія яго суправаджалі, залажылі міну запаволенага дзеяння ў аўтамабіль. Пазней узарвалі станцыйную вадакачку, арганізавалі дыверсіі на льнозаводзе, электрастанцыі, кірпічным заводзе, у камендатуры.

Былы камісар партызанскага атрада імя Варашылава брыгады імя Леніна Барыс Маркіянаў успамінаў: «Кіраўніком падпольнай маладзёжнай арганізацыі была выбрана менавіта Фруза, таму што да таго часу выканала дзясяткі адказных і складаных заданняў, зарэкамендавала сябе выдатным арганізатарам і заслужана карысталася аўтарытэтам сярод таварышаў. Патрыётка, нягледзячы на смяротную небяспеку, кожныя два дні прыносіла ў атрад разведвальную інфармацыю, якую атрымлівала ад Мікалая Аляксеева і Ніны Азолінай, аб руху варожых эшалонаў на фронт і з фронту, характары грузаў».

Зямля гарэла пад нагамі акупантаў. А падпольшчыкі доўгі час заставаліся няўлоўнымі. Толькі пры дапамозе правакатара фашысты натрапілі на след патрыётаў. У канцы лета 1943 года амаль усе былі арыштаваны, а восенню пасля жорсткіх катаванняў і здзекаў расстраляны, не выдаўшы тых, хто застаўся на волі. Толькі дзякуючы шчасліваму выпадку не трапіла ў лапы фашыстаў Фруза. Яна вярталася з задання з Полацка (вазіла туды міны), а Аркадзь Барбашоў, які пазбег арышту, здолеў папярэдзіць яе. Акупанты, не знайшоўшы Фрузы, як заложніц арыштавалі, а потым расстралялі яе маці і цётку.

Вярнулася з вайны Ефрасіння Савельеўна з падарваным здароўем і параненай душой. Пасля вызвалення Віцебска была на камсамольскай рабоце ў Чыгуначным райкаме камсамола. Выйшаўшы па стане здароўя на пенсію, доўгі час працавала ў гарваенкамаце. Нарадзіла і выхавала дачку Святлану, якая стала ўрачом. А кім будзе ўнучка Вікторыя, даведацца не паспела: цяжкая хвароба скасіла Ефрасінню Савельеўну ў 1984-м у 60-гадовым узросце...

«Маё шчасце ў тым, што я здолела прайсці, не спатыкнуўшыся, па цяжкіх дарогах жыцця, усім смерцям назло, перажыць вайну, убачыць сваімі вачыма пераўтворваную, залечваную ад ран родную зямлю, убачыць сонечнае дзяцінства сваёй дачкі Святланы, — гаварыла Ефрасіння Савельеўна ў адным з інтэрв'ю. — Я шчаслівая і ад усведамлення таго, што мне ёсць на што азірнуцца, што для сённяшняй радасці дачкі, для сённяшніх усмешак усіх нашых дзяцей нешта зрабіла і я».

Ефрасіння Савельеўна была камунікабельным, даступным чалавекам, нягледзячы на высокія званні. Яе акружалі шматлікія сябры. І цяпер, у дзень яе нараджэння ля магілы збіраюцца людзі, успамінаючы яе гераічныя справы, ускладаюць кветкі. Яна рабіла ўсё, каб заўтра не памерла ніколі...

**Таццяна КУЗЬМІЧ.**

■ Векапомнае

# На подступах да Лагойска

## Амаль месяц гітлераўцам не ўдавалася прарваць абарону савецкіх войск

**Шмат слаўных старонак упісалі ў летапіс перамогі абаронцы Айчыны на пачатку вайны. Адна з іх — абарона Лагойска ў ліпені 1941 года. На гранітных плітах мемарыяльнага комплексу, што на Паненскай Гары ў Лагойску, выбіты прозвішчы салдат, якія загінулі пры абароне горада. Хто яны, адкуль родам, як тут апынуліся — пра гэта нам, іх нашчадкам, неабходна ведаць і памятаць.**

Каб зразумець, як адбывалася абарона Лагойска, трэба ўзгадаць баявыя дзеянні ў чэрвені 1941-га пад Мінскам. Згодна з планам нямецкага камандавання, танкавыя групы Гота і Гудэрыяна павінны былі замкнуць кальцо акружэння за сталіцай Беларусі. На поўнач ад горада, на кірунку Радашковічы — Заслаўль, наносіў удар 39-ы танкавы корпус Гота. 64-я дывізія палкоўніка Іяўлева заняла абарону на ўсход мястэчка Радашковічы, па лініі Чырвонае — Заслаўль — Рогава. На правым флангу дывізіі, направа ад дарогі Радашковічы — Астрашыцкі Гарадок, абараняўся 288-ы стралковы полк падпалкоўніка Рыгора Кучмістага.

Пачынаючы з 25 чэрвеня, тут праходзілі вельмі цяжкія баі. Пасля шматлікіх атак з прымяненнем танкаў нямцам удалося прабіць абарону 64-й дывізіі. 288-ы стралковы полк аказаўся адрэзаным ад асноўных сіл дывізіі, пазбавіўся сувязі і забеспячэння боепрыпасамі і, каб пазбегнуць акружэння, быў вымушаны адыходзіць разам з артылерыяй у бок Лагойска. На паўночным напрамку Мінск абараняла 100-я дывізія генерала Івана Русіянава. Дывізія заняла пазіцыі каля Астрашыцкага Гарадка на мясцовасці, дзе раней праводзіла адпрацоўку баявых дзеянняў.

Прарваць абарону савецкіх войск гітлераўцам не ўдалося. Чырвонаармейцы прымянілі супраць ворага бутэлькі з бензінам — вялікая колькасць нямецкіх танкаў была ахоплена полымем. 27 чэрвеня генерал Русіянаў загадаў дывізіі перайсці ў наступленне. 331-ы полк наступаў злева ад Астрашыцкага Гарадка. З баямі прайшоў 14 кіламетраў і выйшаў да вёскі Вяча. Тым часам немцы распачалі контратаку з раёна вёскі Беларучы. Батальёны капітана Максіма Старкова і капітана Васіля Бабія адбівалі атакі немцаў, але боепрыпасаў катастрафічна не хапала. У канцы дня немцы пераразалі дарогу на Мачаны, і гэтыя два батальёны 331-га палка трапілі ў акружэнне. Яны аказаліся адрэзанымі ад дывізіі, якая па загадзе адышла ў раён Волмы. Пасля абеду 28 чэрвеня гітлераўцы ўвайшлі ў Мінск.

Вайскоўцы, якім пашчасціла выбрацца з акружэння, аб'ядналіся пад камандаваннем капітана Бабія. Па інфармацыі разведчыкаў, адзіным шляхам для прарыву быў напрамак Лагойска. Ноччу зборны батальён па лесе выйшаў на дарогу Мінск — Лагойск і да раніцы 30 чэрвеня быў у раённым цэнтры. Там ужо знаходзіўся 288-ы полк падпалкоўніка Рыгора Кучмістага. Тым часам пад Плешчаніцы адышла 50-я дывізія генерал-маёра Васіля Еўдакімава, якая да гэтага вяла баі пад Маладзечнам і Вілейкай. Генерал Еўдакімаў перападпарадкаваў сабе 288-ы полк і загадаў Кучмістаму заняць абарону перад Лагойскам.

Па распрацаваным плане 288-ы полк абараняў заходні напрамак непасрэдна перад Лагойскам, а батальён Бабія адказваў за мінскі напрамак. Атрымаўшы боепрыпасы і харчаванне, апошні заняў абарону на дарозе Мінск — Лагойск. Размясціліся на ўскраіне лесу паміж вёскамі Астрошыцы і Чудзенічы, каля павароту з асноўнай дарогі на вёску Мішкавічы. Сёння гэтай вёскі не існуе: у 1943 годзе яе спалілі фашысцкія карнікі.

Пасля разведкі немцы сталі атакаваць пазіцыі батальёна — пачаўся бой. Чырвонаармейцы сустрэлі ворага моцным агнём, батальён утрымліваў свае пазіцыі. Нічога не дабіўшыся, немцы выклікалі артылерыю.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

■ Дарогамі вайны

# Аперацыя «Рэха на Палессі»

## Як партызаны знішчылі чыгуначнае палатно, па якім варожыя цягнікі ішлі на Сталінград

**Гарачым летам 1942 года мой бацька, Васіль Маскальчук, а таксама Канстанцін Міхаленя і Мікалай Чарткоў вырашылі ўступіць у партызанскі атрад. Усім хлопцам было па 18 гадоў. Ісці трэба было ў Петрыкаўскі раён, дзе базіраваліся атрады Палескага злучэння.**

Васіль МАСКАЛЬЧУК з унукам Пятром і праўнучкай Дзіянай.

Раніцай яны былі ўжо ў вёсцы Ветчын Жыткавіцкага раёна. Па дарозе зайшлі да свайго сябра Аляксандра Гаўрыловіча: ён добра ведаў Петрыкаўскі лес і таксама збіраўся ўступіць у атрад. У густым сасновым лесе пад векавой хвояй Саша асцярожна зняў ламачча, пласт зялёнага моху. Дастаў з неглыбокай ямы тры вінтоўкі Мосіна, цяжкі нямецкі кулямёт «МГ-38» з зараджанай стужкай, некалькі цынкавых скрынак з патронамі, каля дзесяці гранат «РГД» і «Ф-1». Позна ўвечары хлопцы былі ўжо ў вёсцы Грабаў Петрыкаўскага раёна, дзе базіраваўся атрад камандзіра Чырвонай Арміі Рыгора Краўца. Камісарам 132-га атрада 130-й петрыкаўскай брыгады быў Тарасаў. Яны і прынялі юнакоў у партызаны.

Неўзабаве сябры атрымалі сваё першае баявое хрышчэнне. Арганізаваўшы засаду, атрад цалкам разграміў фашысцкі абоз, знішчыўшы пры гэтым дзясяткі гітлераўцаў і паліцаяў, захапіў багатыя трафеі — зброю, боепрыпасы, прадукты харчавання, дзясяткі коней. Іх баявы атрад прымаў удзел у знакамітай аперацыі па знішчэнні чыгуначнага моста на рацэ Пціч, аперацыі пад кодавай назвай «Рэха на Палессі», якую правялі ў ноч з 2 на 3 лістапада 1942 года.

Вось што распавядае бацька пра гэтую аперацыю: «...Чыгунка па маршруце Брэст—Пінск—Бранск — адна з асноўных магістраляў, па якой варожыя цягнікі з жывой сілай і баявой тэхнікай ішлі да сцен Сталінграда — туды, дзе вырашаўся лёс усёй краіны. Каб надоўга вывесці дарогу са строю, Мінскі падпольны абкам партыі і штаб злучэння распрацавалі аперацыю па падрыве буйнога чыгуначнага моста праз раку Пціч на найважнейшым стратэгічным участку чыгункі Брэст—Гомель. Назвалі аперацыю «Рэха на Палессі». Для гэтага з вялікай зямлі спецыяльным рэйсам даставілі боепрыпасы і ўзрыўчатку. Мост даўжынёй 150 метраў з чатырма пралётамі размяшчаўся на ўсход ад станцыі Пціч і кругласутачна ахоўваўся двума ўзводамі салдат, якія знаходзіліся ў чатырох дзотах. На ўзбраенні праціўніка меліся кулямёты і гармата. Подступы да моста былі ўмацаваны. Нават замаскіраваныя доты меліся, аб якіх партызаны даведаліся падчас штурму ўмацаванняў. У 800 метрах ад моста на станцыі Пціч размяшчаўся варожы гарнізон, у якім было да 750 салдат і афіцэраў. Акрамя таго, вораг мог хутка падкінуць падмацаванне з суседніх гарнізонаў».

Для правядзення аперацыі штаб злучэння вылучыў 11 партызанскіх атрадаў агульнай колькасцю 1300 чалавек. Ім трэба было разбурыць участак чыгункі паміж станцыямі Муляраўка і Коршаўка, адрэзаць пасёлак і станцыю Пціч ад моста. Каб увесці праціўніка ў зман, партызаны стварылі бачнасць канцэнтрацыі атрадаў каля раённага цэнтра Капаткевічы, а самі за ноч скрытна перакінулі сілы ў раён станцыі Пціч.

З лістапада 1942 года ў шэсць гадзін раніцы групы прыкрыцця падарвалі чыгуначнае палатно і перарэзалі сувязь. Партызаны ўдарных атрадаў, у тым ліку і мой бацька, накіраваліся да моста і адкрылі шчыльны агонь па дзоту і казарме. Абарона была знішчана. Падрыўнікі заклалі пад мост звыш 300 кілаграмаў узрыўчаткі і падарвалі яго. Стратэгічна важная для ворага чыгунка на 18 сутак выйшла са строю. За час перапынку руху праціўнік не змог прапусціць па гэтай дарозе больш за 500 эшалонаў. У баі з ворагам каля моста загінуў слаўны камісар атрада, які прымаў іх у партызаны. Яшчэ дзевяць партызан навечна ляглі каля моста.

**Падхапіўшы дзяўчынку на рукі, астатнія сталі асцярожна сыходзіць са злашчаснага балота. Яшчэ доўга грукатаў Сашаў кулямёт. Потым стральба спынілася...**

Найбольш добра запомніўся бацьку бой за родную вёску Грабаў, дзе прайшло яго дзяцінства. Лютаўскім вечарам 1943 года разведка атрада далажыла, што вялікія сілы карнікаў знаходзяцца ў вёсцы Сялючыцы (гэта 10 кіламетраў ад Грабава). Увечары яны не рызыкнуць наступаць у партызанскай зоне. Але раніцай абавязкова рушаць на Грабаў. Камандаванне трох атрадаў вырашыла заняць абарону і даць карнікам бой. На досвітку паказаліся шматлікія ланцугі ворага. Партызаны падпусцілі немцаў бліжэй і адкрылі агонь. Карнікі кінуліся назад. Замацаваўшыся на могілках, якія размяшчаліся на горцы, фашысты сталі з кулямётаў і мінамётаў запальнымі кулямі абстрэльваць вёску і партызан. Запалала некалькі хат. Пасля абстрэлу фашысты пайшлі ў атаку, але былі вымушаны адкаціцца назад. Яны паспрабавалі абысці партызан з флангаў, аднак камандаванне атрадаў, прадбачыўшы гэты манеўр, выставіла там замаскіраваныя засады, і карнікі былі літаральна скошаны кулямётным агнём. Мяцеліца, якая неўзабаве пачалася, за пару гадзін засыпала трупы гэтых ваякаў.

— У другой палове дня разведчыкі з брыгады далажылі, што на дапамогу фашыстам са станцыі Капцэвічы выйшаў яшчэ адзін варожы атрад колькасцю 600 чалавек, узброены гарматамі і мінамётамі, — успамінае Васіль Маскальчук. —У партызан ужо заканчваліся боепрыпасы. Каб збіць немцаў з панталыку, камандзір нашага атрада Рыгор Кравец накіраваў у іх тыл групу байцоў, у склад якой уваходзіў Канстанцін Міхаленя і Саша Гаўрыловіч са сваім ручным кулямётам. Партызаны, якія добра ведалі гэтыя месцы, абышлі ворагаў і, знішчыўшы з дзясятак карнікаў, вярнуліся назад. Немцы, вымушаныя частку сіл кінуць на абарону свайго тылу, прыкметна аслабілі націск. Позна ўвечары партызанам паступіў загад камандзіра брыгады адысці і замацавацца ў вёсцы Бярозаўка.

Сыходзячы з вёскі, партызаны забіралі з сабой жыхароў, разумелі, што карнікі нікога не пашкадуюць. На раздарожжа праводзіць партызан выйшаў дзед майго бацькі, 100-гадовы Даніла Анікеевіч, удзельнік руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў, баявы гусар, асабіста адзначаны залатымі грашыма за адвагу царом Аляксандрам II. Нягледзячы на свой узрост, ветэран Балканскай вайны яшчэ актыўна дапамагаў партызанам: вазіў зброю, харчаванне. «Я ўгаворваў яго пайсці з намі, але Даніла Анікеевіч адмовіўся», — працягвае бацька. «Не, унук, я сваё ўжо аджыў і нікуды ад маёй дарагой Праскоўі не пайду!» — адказаў стары.

Калі ў вёску ўварваліся карнікі, усіх, хто застаўся, расстралялі, трупы пакідалі ў калодзежы. Данілу Анікеевіча з жонкай Праскоўяй карнікі забілі ў садзе, пад яблыняй. Там і знайшлі іх целы вясной, калі гітлераўцы сышлі з вёскі, якую спалілі дашчэнту.

— У канцы лютага 1943 года ў сваю апошнюю разведку з сябрам Іванам пайшоў Мікалай Чарткоў, — расказвае пра баявога таварыша ветэран. — Доўга мы не ведалі пра лёс Мікалая. Але дзесьці праз месяц узялі ў палон паліцая, які прызнаўся, што быў на яго допыце. Гестапа падвергла партызана нечалавечым катаванням, патрабуючы дакладных звестак пра размяшчэнне атрада, яго колькасці і ўзбраенні. Ён назваў месца дыслакацыі, дзе атрад ніколі не бываў. Наўмысна завышаў колькасць байцоў, яго ўзбраенне. Так нічога і не дамогшыся, фашысты яго замучылі.

Да вясны 1944 года атрады і брыгады Палескага злучэння апынуліся ў прыфрантавой паласе. Фашысцкае камандаванне разумела, якую пагрозу ўяўляюць партызаны, якія дзейнічалі ў тыле іх войска. Атрады брыгады часова распусцілі. Быў дадзены загад прабівацца з акружэння невялікімі групамі.

— Наша група складалася з васьмі байцоў, — распавядае Васіль Міхайлавіч. — Напярадзе ішоў мой сябар Аляксандр Гаўрыловіч, несучы на плячы кідаўшы галлё, мы кінуліся туды. Забягаю ў крайні курань, дзе жанчына чысціла бульбу, і бачу, што эсэсавец расстрэльвае яе з аўтамата. Я ззаду моцна наношу ўдар прыкладам па рагатай касцы з дзвюма маланкамі. Каска падае на зямлю, фашыст рэзка паварочваецца, накіроўвае на мяне аўтамат, але зброя дае асечку. Але тут нешта засвістала, мільганула ў паветры, эсэсавец схапіўся за горла і паваліўся на зямлю. Гэта Саша паспеў кінуць штык-нож у карніка. На шчасце, дзяўчынка засталася жывая.

Раніцай каля лагера з'явіліся карнікі. «Яны былі зусім блізка, — узгадвае былы партызан. — Што рабіць, прыняць бой? Нас толькі 6 чалавек — сілы занадта няроўныя. І гінуць у 20 гадоў нікому не хочацца... З намі ў групе быў пажылы мужчына Міхаіл Дзегцяр. Убачыўшы карнікаў, ён зняў кальцо з гранаты, адышоў ад нас далей, расцісnуў руку... Прагрымеў выбух».

10-я гвардзейская танкавая Гарадоцкая брыгада, 1945 год (Васіль Маскальчук у верхнім радзе крайні справа).

«Ну, бывайце, я думаю, хутка пабачымся, Чырвоная Армія ўжо недалёка!» — усміхнуўся Саша Гаўрыловіч і хутка пабег у бок хвоі, якая ўзвышалася над балотам. Фашысты набліжаліся, ужо выразна былі бачны іх нахабныя твары. І тут з векавой хвоі пачулася доўгая кулямётная чарга. Карнікі падалі ў балотны бруд. Увесь агонь яны перанеслі на адзінокую сасну. Падхапіўшы дзяўчынку на рукі, астатнія сталі асцярожна сыходзіць са злашчаснага балота. Яшчэ доўга грукаў Сашаў кулямёт. Потым стральба спынілася...

Пасля вызвалення Беларусі бацьку накіравалі ў запасны полк у горад Кіраў Бранскай вобласці. Потым ён ваяваў у складзе Прыбалтыйскага фронту на тэрыторыі Літвы. Быў спачатку ў пяхоце, а пазней у складзе 10-й гвардзейскай танкавай Гарадоцкай брыгады. Там жа сустрэў і Перамогу. Яшчэ амаль два гады даслужваў у Лідзе. Дадому ў сваю вёску Камуна Любанскага раёна вярнуўся толькі ў 1947 годзе.

Яго бацька Міхаіл Данілавіч, мой дзед, загінуў яшчэ ў 1941 годзе пад Вязьмай. Вёска, дзе яны жылі, была спалена ў ліпені 1941-га. Яго маці з маленькім Аляксандрам жыла ў зямлянцы. Сярэдні брат бацькі, Мікалай, служыў у Берліне стралком на легендарным штурмавіку «Іл-2».

— Увосень прыйшоў з арміі мой партызанскі сябар Канстанцін Міхаленя, — узгадвае Васіль Маскальчук. — Ён таксама ваяваў на фронце, потым даслужваў, як і я. Недалёка ад лесу, на самым ускрайку вёскі, пачалі мы з Косцем будаваць сабе дамы адзін насупраць аднаго. Часта пасля заняткаў з вучнямі нам дапамагалі дзве сяброўкі-настаўніцы Ліда і Алена. Так атрымалася, што па заканчэнні будаўніцтва я ажаніўся з Лідай, а Косця з Аленай. Нашы маладыя жонкі пасадзілі пад вокнамі белыя акацыі.

Прайшло шмат гадоў. Зараз нашу вёску не пазнаць. Пабудавана шмат новых дамоў, новая школа, клуб. Зямлянкі, у якіх жылі людзі, мала хто памятае. Але два першыя дамы, узведзеныя пасля страшнай вайны маім бацькам і яго баявым сябрам Косцем (маім хросным), стаяць і дагэтуль адзін насупраць аднаго. А каля іх красуюць велізарныя акацыі, калісьці пасаджаныя на шчасце маёй маці Лідзіяй Цімафееўнай і яе сяброўкай Аленай Усцінаўнай. Кожную вясну яны пышна расцвітаюць, напаўняючы цудоўным водарам усё навакольле.

**Міхаіл МАСКАЛЬЧУК,**
*Бераставіцкі раён*

■

# ВЕРХАМ НА АЎТАЖЫРЫ

■ Людзі і лёсы

## БАЯВЫЯ ІМГНЕННІ ВЕЧНАСЦІ

**Я не бачыў яго жывога, калі ажаніўся з яго дачкой. Мой цесць рана пайшоў з жыцця — у 46 гадоў. Вайна ўсё-такі дагнала яго: параненая нага, спіна і цяжкая кантузія ў пекле баёў не прайшлі бясследна. На паліцы з кнігамі засталася вялікая каляровая фатаграфія: малады лейтэнант з чорным прыгожым чубам, з вялікімі ўдумлівымі вачыма. На першы погляд — копія вядомага артыста Вячаслава Ціханава з фільма «Сямнаццаць імгненняў вясны».**

Уладзімір Васільевіч Нісцюк нарадзіўся ў вёсцы Вялікая Уса Уздзенскага раёна. Пасля школы паехаў у Маскву да старэйшага брата, дзе скончыў афіцэрскія курсы і атрымаў званне лейтэнанта. Спачатку служыў у Маскве, а калі грымнула вайна, стаў мінамётчыкам 93-га стралковага палка 76-й стралковай дывізіі. Якімі шляхамі вайны прайшоў ён, дзе ваяваў — ніколі не любіў расказваць сваёй жонцы, зямлячцы Яўгеніі Аляксееўне і дзецям. А можа, не хацеў вяртацца ў тыя дні, на тыя дарогі, дзе ішла смерць з пажарамі, крывёю і слязьмі, вялікімі стратамі аднапалчан. Узнагарод яго і дакументаў на іх не засталося: магчыма, прапалі ў час пераезду. Дачка Ала сцвярджала, што ён быў узнагароджаны двума ордэнамі Славы. А гэта — вялікі гонар, бо тры такія ордэны прыраўноўваліся да звання Героя Савецкага Саюза.

Юбілей Вялікай Перамогі падштурхнуў мяне да пошуку. Афіцыйны сайт Міністэрства абароны Расійскай

Уладзімір Нісцюк (злева) з баявымі сябрамі.

Федэрацыі агульнадаступнага банка даных выдаў мне ліст на ўзнагароджанне Уладзіміра Васільевіча ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Скупыя радкі не перадаюць агульную карціну наступлення нашых войскаў і адчайнае супраціўленне ворага: «т. Нісцюк 19.04.45 года ў баях на заходнім беразе р. Одэр, падтрымліваючы агнём сваіх кулямётаў наступаючыя падраздзяленні, прымусіў замоўкнуць 7 агнявых кропак і знішчыў не менш за 13 нямецкіх салдат, чым садзейнічаў паспяховаму руху наперад 8-й стралковай роты. У баі 23.04.45 года пры фарсіраванні канала Гагенцолерн з першым разлікам пераправіўся на заходні бераг, замацаваўся на занятым рубяжы і агнём сваіх кулямётаў даў магчымасць пераправіцца іншым падраздзяленням. У час адбіцця контратакі, калі выйшаў са строю наводчык, сам лёг за кулямёт і трапным агнём прымусіў замаўчаць тры агнявыя кропкі, знішчыўшы 11 нямецкіх салдат і захапіўшы 15 у палон. У баі 26.04.45 года за в. Гатаў ён са сваім узводам знішчыў 12 нямецкіх салдат і захапіў у палон 93 салдаты».

На сайце Міністэрства абароны больш нічога не значылася. Я паслаў запыт у Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, які знаходзіцца ў Падольску. Прыйшло пацвярджэнне, што Уладзімір Васільевіч Нісцюк, акрамя ордэна Айчыннай вайны, узнагароджаны двума ордэнамі Славы і медалямі «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.» і «За ўзяцце Берліна». Апісанняў узнагародных лістоў няма. Але я веру, што недзе ў архівах захаваліся пажоўклыя старонкі яго баявога шляху.

Пасля вайны Уладзімір Васільевіч працаваў у міліцыі ў Мінску, а таксама на вагонарамонтным заводзе. Выгадаваў сына і дзвюх дачок. А яшчэ быў выдатным чырванадрэўшчыкам. У мяне на дачы ў вёсцы стаяць яго прыгожы шыфаньер і вялікае люстэрка з тумбачкай. Бязлітасная вайна дагнала яго ў 1970 годзе — маладога, статнага, з іскрынкай у чорных вачах.

**Алесь КАМАРОЎСКІ**

■

Узляцелі!

**Аўтажыр, нават у параўнанні з верталётам, больш бяспечны. Яму не страшны ні страта хуткасці, ні адказ матора.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

У адрозненне ад тых жа самалётаў і верталётаў гіраплан абсалютна не баіцца ветру. На ім таксама можна лятаць на гранічна малых вышынях, ноччу, у любое надвор'е, што на самалёце рабіць вельмі небяспечна. Любы парыў ветру — і самалёт можа апынуцца на зямлі. Аўтажыр нават больш устойлівы, чым верталёт. Сёння, як запэўніваюць спецыялісты, гэта самы бяспечны лятальны апарат у лёгкай авіяцыі.

— Асноўная вартасць гіраплана, акрамя таго, што ён можа вырашаць практычна задачы верталёта, — сабекошт яго палёту, абслугоўвання і эксплуатацыі дзесьці ў 50 раз таннейшы, чым у верталёта, — заўважае **начальнік Цэнтра спецыяльнай падрыхтоўкі палкоўнік Андрэй КРАСОЎСКІ.** — Між іншым, абслугоўваць аўтажыр здольны сам экіпаж. Для таго каб навучыць лётчыка кіраваць верталётам, неабходна мінімум 5 гадоў. Каб у дасканаласці засвоіць гіраплан, дастаткова паўгода.

Нягледзячы на тое, што асвоіць апарат можа нават той, хто ні разу ў жыцці не сядзеў за штурвалам, вучыцца на ім лятаць запрасілі далёка не навічкоў. Кіраваць аўтажырам лётны склад вучыць Рыгор Агабабаў. Яго налёт на гэтых апаратах заслугоўвае павагі — 4 тысячы гадзін! Агульны налёт лётчыка — больш чым 6 тысяч гадзін.

Вопытнымі лётчыкамі з'яўляюцца і яго вучні. Напрыклад, начальнік мабільнай групы аўтажыраў пінскага пагранічнага атрада маёр Генадзь Мікуцкі дагэтуль лятаў на самалётах «Л-39» і «Су-25», верталётах «Мі-8» і другім пілотам на французскім верталёце «Кюрэль».

— Калі на самалёце або верталёце выкананне манеўраў патрабуе ад пілота высокай засяроджанасці, то на аўтажырах іх можна выконваць, не звяртаючы ўвагі на абмежаванні, — кажа пагранічнік. — Выключная эканамічнасць гіраплана! Яго расход такі ж, як і ў пазадарожніка. А абслугоўванне ідэнтычнае аўтамабілю.

— Нават матацыклу! — дапаўняе калегу старшы лётчык мабільнай групы аўтажыраў старшы лейтэнант Алег Прошын. — У акадэміі вучыўся лятаць на планеры «Бланік» Л-13, што спрыяе лёгкасці пераўчвання на гіраплан. Мэтавая нагрузка, якая прадугледжана на гэтым лятальным апараце (цеплавізары, відэакамеры), значна аблегчыць пошук парушальнікаў.

Прычым, каб затрымаць парушальнікаў дзяржаўнай мяжы, экіпаж аўтажыра можа прызямліцца на любым участку. Хоць на АЗС, дзе адразу можа заправіцца звычайным аўтамабільным бензінам. Расход — каля 15-18 літраў у гадзіну. На адной запраўцы гіраплан можа пратрымацца ў паветры каля пяці гадзін, пераадолець прыкладна 700 кіламетраў.

— Сярэдняя хуткасць аўтажыра складае 120 — 140 кіламетраў у гадзіну, — расказвае Андрэй Красоўскі. — Мінімальная — да 50 кіламетраў у гадзіну. На гэта не здольны ніводзін самалёт. Максімальная вышыня — 4 тысячы кіламетраў. Але падымацца так высока няма сэнсу. Найбольш эфектыўнае патруляванне праходзіць якраз на малых і звышмалых вышынях. У рамках эксперымента мы даследавалі, на якой адлегласці будзе чуваць рухавік аўтажыра. Аказалася, што за кіламетр-два. Але ўлічваючы тое, што гэтыя два кіламетры ён пралятае за адну хвіліну, ні адзін парушальнік не паспее схавацца.

Вядома, беларускія пагранічнікі больш прызвычаіліся да верталётаў. Але са з'яўленнем аўтажыра той жа верталёт «Мі-8» зараз неабходны толькі для вырашэння адной задачы — транспартнай. А ўсё, што тычыцца маніторынгу, патрулявання дзяржаўнай мяжы, на гіраплане рабіць нашмат лягчэй і прасцей. Ён вельмі манеўраны: такія фігуры найвышэйшага пілатажу верталёту не па сілах! У пагранічнікаў яшчэ ёсць час, каб іх засвоіць. А як толькі на ўзбраенне паступяць астатнія аўтажыры, яны прыступяць да аховы дзяржаўнай мяжы.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*
**Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.**
*Барысаўскі раён.*

# На подступах да Лагойска

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

Вось як запомніў тыя падзеі жыхар Астрошыц Мікалай Жалабковіч: «...Немцы ішлі з Астрашыцкага Гарадка і падышлі да лесу. Потым праехала разведка на матацыклах з каляскай. Нашы іх там пабілі. Пачаўся бой. Немцы бачылі, што не могуць прайсці. Тады зацягнулі на ўзгорак гарматы і пачалі абстрэльваць лес каля павароту на Мішкавічы — там стаялі савецкія салдаты. Снарады праз нашу вёску ляцелі, а яны не адказвалі: відаць, няма чым было страляць, гармат не было...».

**Самымі каштоўнымі знаходкамі сталі эбанітавыя капсулы, у якія салдаты звычайна ўкладвалі свае асабістыя даныя. На гэты раз яны не былі пустымі.**

Сапраўды, на ўзбраенні зборнага батальёна былі толькі вінтоўкі і кулямёты. Таццяна Шавель, якая жыла тады ў Астрошыцах, успамінае: «...У лесе паміж Чудзенічамі і Астрошыцамі былі нашы салдаты. Немцы ведалі пра гэта. Яны стралялі па лесе, снарады ляцелі праз нашу хату і там ірваліся. Усё гуло вакол. Тата нас усіх вывеў на вуліцу і парассаджваў па адным, каб усім разам не загінуць. Потым стала ціха. Пад вечар прыйшлі нашы салдаты і спыталі медыкаў. Мой тата быў фельчарам, з ім акушэрка працавала. Вось мы і пайшлі ў лес, і я з імі. Там страх колькі было пабітых. Адзін салдат мёртвы ляжаў каля дрэва. На яго грудзях была фотакартка — на ёй жанчына і двое дзетак... Сказалі параненым дапамогу, усіх цяжкіх увечары адправілі ў Астрошыцы. Некаторых перапранулі і на падводах уначы павезлі ў Лагойск, у бальніцу. Мёртвых пахавалі там жа, у лесе».

Да Лагойска параненыя не даехалі: там ужо былі немцы. Каб не трапіць у акружэнне, Бабій загадаў пакінуць пазіцыі і адыходзіць у бок Барысава. Рухаючыся па прасёлкавых і лясных дарогах, 18 ліпеня 1941 года чырвонаармейцы выйшлі да сваіх у раёне Смаленска. У гэты ж час 288-ы полк заняў абарону перад Лагойскам, перарэзаўшы ўсе асноўныя дарогі, якія вялі ў райцэнтр.

Адразу заняць Лагойск у гітлераўцаў не атрымалася. Доўга працягваўся жорсткі бой, некалькі атак адбілі чырвонаармейцы. Пакуль былі боепрыпасы, нягледзячы на страты, полк утрымліваў пазіцыі. Гэта стала немагчымым, калі ў небе з'явілася нямецкая авіяцыя. Ацалелыя пасля бою чырвонаармейцы вымушаны былі адступіць у лясы Лагойска. Гітлераўцы занялі раённы цэнтр. На доўгія тры гады Лагойшчына апынулася ў акупацыі.

Жыхар вёскі Малінаўка Філіцыян Загорскі быў сведкам тых падзей: «Немцы ішлі з Лагазы, а нашы вырылі акопы пад Лагойскам. Па гары, якая звалася Плітніца, арганізавалі абарону. Там, дзе зараз стаяць помнікі, былі акопы. Немцы наступалі па лагазінскай дарозе: і браневікі, і танкі, і салдаты ішлі. Многа тут паклалі нашых салдат: яны каля дубоў пахаваны».

Рэчы, знойдзеныя на месцы баёў пад Лагойскам.

Сёння пра абарону Лагойска нагадваюць абеліскі, якія знаходзяцца на месцах былых баёў, недалёка ад дарогі Мінск — Віцебск. Але мінулае час ад часу нагадвае пра сябе. Вясной 2008 года падчас правядзення рэканструкцыі гэтай дарогі бульдозер нечакана вывернуў на паверхню зямлі скрыню з боепрыпасамі. Салдаты з 52-га спецыялізаванага пошукавага батальёна, якія выехалі на месца, паднялі з зямлі астанкі чалавечых целаў, боепрыпасы, фрагмент кулямёта «Максім» з заеўшым патронам, чаравікі з абмоткамі, кацялкі, пляшкі і іншыя прадметы. Самымі каштоўнымі знаходкамі сталі эбанітавыя капсулы, у якія салдаты звычайна ўкладвалі свае асабістыя даныя. На гэты раз яны не былі пустымі.

Высветлілася, што ў складзе кулямётнага разліку ваявалі салдаты з Кардымаўскага раёна Смаленскай вобласці Яўген Міхайлавіч Івашкаў (1915 г. н.), Васіль Канстанцінавіч Валасянкоў (1912 г. н.), а таксама ўраджэнец вёскі Валошкава Ягор'еўскага раёна Маскоўскай вобласці Сяргей Андрэевіч Сураў (1912 г. н.). Усе яны лічыліся зніклымі без вестак. Адразу ж да пошукаў сваякоў загінулых салдат далучыліся лагойскія журналісты.

— Вялікая ўдача, што знайшлі медальёны з запіскамі, — расказвае Ірына Станкевіч. — Гэта дазволіла раённым уладам Лагойшчыны перапахаваць астанкі герояў на могілках горада не як безыменных салдат, а з імёнамі на абеліскаў. У выніку пошукаў знайшліся сваякі Валасянкова і Сурава. Пазней разам з сынам і пляменніцай наведала Лагойск дачка Івашкава. Прызнацца, былі трывога і сумненні: раптам Яўгенія Яўгенаўна захоча павезці з сабой астанкі бацькі? Але жанчына разважыла так: «Шэсцьдзесят сем гадоў бацька ляжаў у вашай зямлі. Яна зараз для яго не менеў родная, чым смаленская. Побач з ім — яго таварышы. Тыя, на якіх ён разлічваў у цяжкую хвіліну...».

Зусім нядаўна высветлілася, што і ў іншых загінулых салдат былі медальёны. Як сцвярджае мясцовая жанчына, якая жыла тады ў Малінаўцы, яе бацька прынёс з месца пахавання салдат шмат медальёнаў і дзесьці схаваў, збіраючыся захаваць іх да вызвалення. Але ў лютым 1943 года ён быў расстраляны немцамі за сувязь з партызанамі, а месца захоўвання капсул з тых часоў невядомае. Будзем спадзявацца, што і гэтая таямніца калісьці адкрыецца.

**Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ, фота аўтара.**
*г. Мінск.*

Адказная за выпуск Вераніка КАНЮТА. kanyuta@zviazda.by

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Медпласт» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу:**

**г. Гомель, ул. Богдана Хмельницкого, 79, в составе:**

**Здание цеха пластмассовых изделий**, общ. пл. 2269 кв.м, инвентарный номер: 350/С-43619.
Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки, сени, служебное помещение, ворота, забор

**Трансформаторная подстанция № 181**, общ. пл. 96,8 кв.м, инвентарный номер: 350/С-78584.
В т.ч. **трасформатор** инв. № 40041

**Водопроводная сеть**, инвентарный номер: 350/С-138467

**Канализационная сеть**, инвентарный номер: 350/С-138487

**Начальная цена с НДС – 3 330 441 600 белорусских рублей**

Для эксплуатации и обслуживания трансформаторной подстанции №181, продавцу предоставлен на праве аренды (срок действия: с 15.04.2014 по 31.03.2019) земельный участок пл. **0.0244 га,** с установленными ограничениями – охранная зона линий электропередачи, площадь 0.0038 га. К трансформаторной подстанции подключены 16 субабонентов.

Для эксплуатации и обслуживания здания цеха пластмассовых изделий продавцу на праве аренды (срок действия: с 15.04.2014 по 31.03.2019) предоставлен земельный участок пл. **0.2865 га,** с установленными ограничениями – охранных зона линий связи и радиофикации, площадь 0.0386 га; охранная зона линий электропередачи, площадь 0.0105 га; охранная зона сетей и сооружений водоснабжения, площадь 0.0365 га; охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0.0365 га; охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0.0053 га

**Арендаторы:** ЗАО «БеСТ» – участок асфальтобетонного покрытия под установку конструкции антенной мачты высотой Н-26 и контейнера с оборудованием сотовой связи, общей площадью 25 кв.м (срок действия договора по 18.08.2017 г.). ИП Клещук В.А. – помещение на 1 этаже здания цеха пластмассовых изделий для размещения участка по производству корпусной мебели, общей площадью 48,16 кв.м (срок действия договора по 15.04.2018)

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется в белорусских рублях р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Оплата за предмет аукциона производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, который должен быть подписан в течение **десяти рабочих дней** после проведения аукциона. По согласованию с продавцом возможна рассрочка оплаты

| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | 1) капитальное строение, инв. № 420/С-4636 (назначение – здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей, наименование – здание санатория второй категории), площадью 2146,8 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, санаторий «Радуга».<br>2) капитальное строение, инв. № 420/С-54646 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция), площадью 46,7 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/2, трансформаторная подстанция, санаторий «Радуга».<br>3) капитальное строение, инв. № 420/С-44135 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – здание котельной), площадью 204,9 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/3, котельная, санаторий «Радуга».<br>4) капитальное строение, инв. № 420/С-37459 (назначение – здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения, наименование – здание спорткомплекса санатория «Радуга»), площадью 1824,7 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/6, спорткомплекс, санаторий «Радуга».<br>5) капитальное строение, инв. № 420/С-54648 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж на 2 автомашины со складом и навесом), площадью 460,5 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/4, гараж, санаторий «Радуга».<br>6) капитальное строение, инв. № 420/С-54647 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – овощехранилище), площадью 49,3 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/1, овощехранилище, санаторий «Радуга».<br>7) капитальное строение, инв. № 420/С-44134 (назначение – здание многоквартирного жилого дома, наименование – восьмиквартирный жилой дом), площадью 502,5 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123/5, жилой дом, санаторий «Радуга».<br>8) капитальное строение, инв. № 420/С-55306 (назначение – сооружение специализированное транспорта, наименование – подъездная автодорога), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, подъездная автодорога к санаторию «Радуга».<br>9) капитальное строение, инв. № 420/С-55097 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – очистные сооружения), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, в районе д. Докудово 2, очистные сооружения.<br>10) капитальное строение, инв. № 420/С-54776 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, сооружение благоустройства, санаторий «Радуга».<br>11) капитальное строение, инв. № 420/С-54932 (назначение – сооружение специализированное оздоровительного назначения, наименование – навес-площадка для летнего отдыха), площадью 0,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, навес-площадка для летнего отдыха, санаторий «Радуга».<br>12) капитальное строение, инв. № 420/С-54915 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия наружного освещения), протяженностью 1411,5 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, линия наружного освещения санатория «Радуга».<br>13) капитальное строение, инв. № 420/С-55549 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – линия электропередачи 10 кВ), протяженностью 7397,7 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, линия электропередачи 10 кВ к санаторию «Радуга»;<br>14) капитальное строение, инв. № 420/С-54918 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – тепловая сеть), протяженностью 322,3 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, тепловая сеть санатория «Радуга».<br>15) капитальное строение, инв. № 420/С-54916 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть ливневая), протяженностью 267,6 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, канализационная сеть ливневая санатория «Радуга».<br>16) капитальное строение, инв. № 420/С-54917 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть хозфекальная), протяженностью 769,8 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, канализационная сеть хозфекальная санатория «Радуга».<br>17) капитальное строение, инв. № 420/С-54919 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 478,3 м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, водопроводная сеть санатория «Радуга».<br>18) Приставная горка РИМ-1 с 2-мя спусками;<br>19) Стела-указатель МФ/ЛК1 3500;<br>20) Автоматическая система пожарной сигнализации здания санатория;<br>21) Антенна;<br>22) Аппарат «Рефтон-01-Ф-Л-С" ГТ-ДДТ-лазер – 2 шт;<br>23) Аппарат биопрон PAG-890;<br>24) Аппарат д/магнит пдмт-01;<br>25) Аппарат для очистки воздуха TERAPY AIR;<br>26) Аппарат для приготовлен. напитков PRO 40T;<br>27) Аппарат для приготовлен. напитков PRO 60T;<br>28) Аппарат для CMB терапии ЛУЧ-3;<br>29) Аппарат для электроакупунктуры ZEPTER;<br>30) Аппарат кассовый ЭКР-3110-Ф;<br>31) Аппарат компресс терапии Lympa-mat Digital Gradient;<br>32) Аппарат магнито-, фототерапии фотоспок;<br>33) Аппарат УВЧ-66;<br>34) Аппарат ультрозвуковой УЗТ-101;<br>35) Аппарат ундатерм УВЧ-80-3;<br>36) Аппарат электротерапии РАДИУС-01;<br>37) Бильярд – 2 шт;<br>38) Биологическая очистительная установка;<br>39) Ванна бальнеологическая Вулкан ВБ00;<br>40) Ванна бальнеологическая Вулкан ВБ – 03;<br>41) Ванна бальнеологическая «Гейзер»;<br>42) Ванна водолечебная ВЛ;<br>43) Ванна-капсула Harmony Pro;<br>44) Велотренажер 5450;<br>45) Вентилятор ВД-1,6 - 2 шт;<br>46) Вентилятор ВО 06-300 №5;<br>47) Весы ВТН-10;<br>48) Весы электронные «Меркурий» 315;<br>49) Вибрационный снаряд (тренажер);<br>50) Витрина холодильная ВХС 030;<br>51) Выпрямитель сварочный ВД-306У3;<br>52) Газонокосилка JET55S 5.5л;<br>53) Горизонтальный морозильный ларь GTE 3702;<br>54) Дизель-генераторная установка RID 130DS CABP;<br>55) Душевая кафедра ДШ-2;<br>56) Дымосос Д-2,8;<br>57) Дымосос ДН-3,5;<br>58) Ингалятор Бореал F400 – 2 шт;<br>59) Ингалятор ультразвуковой «АЛЬБЕДО»;<br>60) Камера холодильная сборная КХС-2;<br>61) Камеры В/В КСО-366 – 4 шт;<br>62) Кислородный концентратор серии 7F-3L;<br>63) Комплект массажных кушеток;<br>64) Комплект спортивных тренажеров;<br>65) Компрессор С 415М;<br>66) Компьютер BELSOFT;<br>67) Компьютер «АСТЛАЙН»;<br>68) Конвекционная печь ХВ 603G;<br>69) Косилка КСФ-2.1 Б4;<br>70) Котел водогрейный КВ-РТ-0,5-95;<br>71) Котел КВ-П-0,3-95;<br>72) Котел стальной водогрейный КВ-0,93 (КД);<br>73) Кофемашина;<br>74) Кусторез 240 R;<br>75) Кусторез бензиновый Efco;<br>76) Кушетка многофунк. КМ-11;<br>77) Локальная компьютерная сеть санатория «Радуга»;<br>78) Мармит ПМЭС-78К-1-3 для первых блюд на 3 конфорки;<br>79) Массажер-стимулятор термотерапевтический: модель NM;<br>80) Машина кухон. универсал УКМ-П;<br>81) Машина посудомоечн. МПУ-700-01;<br>82) Машина протирочная МПР-35М-02;<br>83) Машина уборочная МУ-320;<br>84) Мотопомпа ВНБ 100;<br>85) Насос SENA;<br>86) Насос STA-RITE ONGA 800-E SERIES;<br>87) Насос к 20/30 с эл. двигателем;<br>88) Насос ЭЦВ 6-10;<br>89) Ноутбук ASYS;<br>90) Облучатель ОБН-150 – 2 шт;<br>91) Оборудование для грязевых физиотерапев. процедур FW4060E;<br>92) Осушитель воздуха Master DH 62;<br>93) Парафинонагреватель;<br>94) Платежный терминал HYPERCOM OPTIMUM T4210;<br>95) Плита электр. пром ПЭМ6-010;<br>96) Пожарная сигнализация и система оповещения людей о пожаре физкультурно-оздоровительного комплекса санатория Радуга;<br>97) Пожарная сигнализация и система оповещения людей о пожаре 8-квартирного жилого дома;<br>98) Полуприцеп ПСТ-3,5;<br>99) Прибор Амплипульс-5;<br>100) Принтер HP 1320;<br>101) Пульт безопасности ПБКТ-1;<br>102) Пылесос промышленный – 5 шт;<br>103) ПЭВМ Сильверадо;<br>104) Радиомикрофон;<br>105) Расходомер РСМ 05.03 Ду-100;<br>106) Сковорода электр. секцион СЭС-0,55;<br>107) Станок деревообрабатывающий АРС-511;<br>108) Станок заточной;<br>109) Стерилизатор ГП-20;<br>110) Стерилизатор ГП-80;<br>111) Стол теннисный – 2 шт;<br>112) Счетчик СА 4У678;<br>113) Счетчик СА4И 672 – 3 шт;<br>114) Счетчик СА4И 678;<br>115) Таксофон 'АГАТ- 07';<br>116) Телефакс KX FT 902 RU;<br>117) Теплообменник ТАР -0,15-14.1 с обвязочной схемой;<br>118) Теплосчетчик ТЭМ-104-1;<br>119) Теплосчетчик ТЭМ-104-2;<br>120) Травокасилка Хускварна 143 R;<br>121) Трансформатор ТМ-160/10;<br>122) Тренажер;<br>123) Тренажер «Старт»;<br>124) Универсальная кухонная машина УКМ-06;<br>125) Установка для восходящего душа УВД;<br>126) Установка для циркулярного душа УЦД;<br>127) Устройство разогрева озокерита и парафина «Ратон»;<br>128) Устройство Реабокс – 2 шт;<br>129) Холодильный шкаф ШВ-044-20;<br>130) Четырехкамерная ванна для рук и ног;<br>131) Швейная машинка электрическая;<br>132) Шкаф ЗАК Щ 7671 А 712 - 2 шт;<br>133) Шкаф управления ШУ-РА 3213.000000.00..220 1Р51;<br>134) Шкаф холод СМ114-S;<br>135) Шкаф холодильный ШХ-0.8 м;<br>136) Шкаф-витрина ШВУ-0.4-1.3-20;<br>137) Эл. плита 4-конфорн. 2140-2 – 2 шт;<br>138) Эл. плита настольная. ЭНТШ-5-2 «Гомельчанка»;<br>139) Электрокардиограф «Кардиовит АТ-1»;<br>140) Электропогрузчик ЕВ-687-28-22;<br>141) Перфоратор GBH 2-26 DFR 800ВТ;<br>142) Бензопила Н-365 15;<br>143) Фонтан керам., иск., в комп., в кашпо;<br>144) Набор Кремень;<br>145) Набор Баллада;<br>146) Шкаф для одежды – 4 шт;<br>147) Спальня «Мара»;<br>148) Набор корпусной мебели «Молодечно»;<br>149) Кухонный гарнитур «Барокко»;<br>150) Набор мягкой мебели;<br>151) Комплект кухни;<br>152) Набор мебели для спальни «Глория»;<br>153) Набор мягкой мебели – 2 шт;<br>154) Набор корпусной мебели «Крокус»;<br>155) Мягкая мебель «Светлана»;<br>156) Набор кухонной мебели «Речица»;<br>157) Набор корпусной мебели «Полесье»;<br>158) Набор угловой мебели «Янтарь»;<br>159) Набор мебели «Александрия»;<br>160) Барная стойка;<br>161) Набор мягкой мебели «Янтарь»;<br>162) Шкаф 1000*600*2000;<br>163) Шкаф 1175*600*1850;<br>164) Шкаф-купе (лам пл. сосна) – 9 шт;<br>165) Диван Изабель 2 3М ТК8 – 2 шт;<br>166) Шкаф-купе (лам,пл,виш) – 2 шт;<br>167) Шкаф-купе с зеркалом Д-4100-10;<br>168) Шкаф-купе с зеркалом Д-4100/01-10 – 6 шт;<br>169) Диван-кровать 3-местный – 7 шт;<br>170) Диван Мичиган 3М;<br>171) Шкаф 3-дверн. Венеция;<br>172) Шкаф с витриной Венеция;<br>173) Тумба Венеция;<br>174) Стол 2-х тумб Венеция;<br>175) Кровать 2-спальная;<br>176) Шкаф с витр. Верди – 2 шт;<br>177) Шкаф 3-Х Верди;<br>178) Н-р д/кухни Стелла – 6 шт;<br>179) Стол обеден. Верди;<br>180) Кровать Венеция;<br>181) Диван Изабель – 2 шт;<br>182) Диван Изабель 2 2М ТК 663 – 10 шт;<br>183) М/М Барии;<br>184) М/М Хилтон – 2 шт;<br>185) Диван Мичиган 3М;<br>186) Диван Мичиган – 2 шт;<br>187) Стол туалетный Венеция;<br>188) М/М Моника;<br>189) Диван Изабель 2 2М ТК 663;<br>190) Шкаф с витриной Венеция;<br>191) Шкаф-купе1910*430*2300;<br>192) Шкаф-купе 2500*650*2300;<br>193) Барьер 1;<br>194) Барьер 2;<br>195) К/м Медео-2син 15 набор;<br>196) Диван угловой Хилтон 3ML90R кожа 4060;<br>197) Буфет-Бар Викинг GL-05/01;<br>198) Шкаф Ника П 024 53Б (венге);<br>199) Лавка угловая 1500*1450 с надстройкой;<br>200) К-т мебели д/столовой 2730*460*11609 (стойка раздвижная –постформинг);<br>201) К-т кухонный (стол 800*800*730 – 1 шт. и 4 стула) – 3 шт;<br>202) Шкаф-купе 1400*650*2200;<br>203) К-т мебели д/гардеробной 2300*570*2000 (вешалка стеновая);<br>204) Ковер 2х3 – 2 шт;<br>205) Ковер;<br>206) Ковер 3Х5;<br>207) Ковер 2,5Х3,55;<br>208) Сейф металлический – 2 шт;<br>209) Уличная светодинамическая конструкция LED-EM-003-12V;<br>210) Уличная светодинамическая конструкция LED-EM-003;<br>211) Пылесос SAMSUNG;<br>212) Холодильник «Минск»268';<br>213) Холодильник «Атлант» КШ-235/22 – 3 шт;<br>214) Холодильник МХТЭ-30-01-ХХ – 4 шт;<br>215) Холодильник «Стинол»;<br>216) Холодильник МХТЭ 30-01-60 – 2 шт;<br>217) Холодильник МХ-365-00;<br>218) Холодильник Свияга;<br>219) Холодильник Минск-11;<br>220) Холодильник Минск-212;<br>221) Электроплита ПЭ-051 с вставкой;<br>222) Телевизор Горизонт 51CTV-732 – 10 шт;<br>223) Телевизор Витязь 63 CTV 6241;<br>224) Телевизор Витязь;<br>225) Телевизор Горизонт – 14 шт;<br>226) Телевизор HORIZONT 42LCD825 – 2 шт;<br>227) Телевизор Горизонт 32 LCD 826 – 2 шт;<br>228) Телевизор Витязь 32LC0 811-1Т с кронштейном;<br>229) Телевизор Горизонт 32LCD840;<br>230) Видеомагнитофон;<br>231) Телевизор SAMSUNG;<br>232) Телевизор Горизонт – 16 шт;<br>233) Дека профессиональная;<br>234) Компакт проигрыватель;<br>235) Пульт микшерного ДМ-10;<br>236) Усилитель мощности 'PILOT';<br>237) Акустическая система – 2 шт;<br>238) Прожектор «кластер» – 2 шт;<br>239) Проигрыватель LG 6000;<br>240) Акустическая система BS 152 – 2 шт;<br>241) Усилитель SOUND KING SK 612;<br>242) Музыкальный центр AS-135;<br>243) Кухонный комбайн PHILIPS;<br>244) Печь СВЧ DAEWOO;<br>245) Фритюрница PHILIPS;<br>246) Электрокамин Viana;<br>247) Озеленение территории санатория (Деревья: береза – 89 шт, сосна – 632 шт, яблоня – 18 шт, ель – 7 шт, слива – 2 шт, липа – 2 шт, каштан – 2 шт, рябина обыкновенная – 1 шт, акация – 3 шт, вишня – 8 шт, дуб черешчатый – 22 шт, дуб – 39 шт., Кустарники: кизильник черноплодный – 5 шт, туя – 36 шт, барбарис – 11 шт, спирея – 31 шт, лапчатка – 19 шт, можжевельник – 31 шт, ива – 2 шт, магония – 5 шт, самшит – 2 шт, роза – 8 шт, виноград дикий – 1 шт, гортензия метельчатая – 4 шт, гортензия – 8 шт, стефанадра 3 шт, сирень – 13 шт, чубушник – 5 шт, дерн – 6 шт, миндаль трехлопостный – 1 шт, пузыреплодник желтолистный 3 шт, лещина обыкновенная 1 шт, рябина черноплодная – 1 шт, ива серебристая – 1 шт, рододендрон – 2 шт, хеномепес – 1 шт.). |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | Лот № 1 расположен на земельных участках:<br>1) кадастровый номер 423685402526000194 (назначение – для обслуживания очистных сооружений), площадью 1,2499 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, в районе д. Докудово 2, очистные сооружения.<br>2) кадастровый номер 423685402526000195 (назначение – для обслуживания канализационно-насосной станции), площадью 0,0050 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, в районе д. Докудово 2, канализационно-насосная станция.<br>3) кадастровый номер 423683500028000004 (назначение – для обслуживания санатория второй категории «Радуга»), площадью 4,6196 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, 123, санаторий «Радуга».<br>4) кадастровый номер 423685400026000022 (назначение – для обслуживания подъездной автомобильной дороги), площадью 1,2225 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Третьяковский с/с, в районе д. Докудово 2.<br>5) земельные участки для обслуживания капитального строения, инв. № 55549 (линия электропередачи 10 кВ): 423650600001000996 (площадью 0,0014 га), 423650600002000

■ Хто каго?

# «Не чакай, Пятрусь, улову, Там, дзе шум, — не будзе клёву...»

**Што было — было, і сведак таму — мільён, бо паказалі па тэлебачанні. У маладзіцы падчас адной інтэлектуальнай гульні спыталіся: «Якая рака працякае праз Мінск?» — «Ды многа іх», — здалёк пачала прыгажуня, успамінаючы геаграфію. «Назавіце хоць адну». — «Сож».**

Слоў няма: прыгожая рэчка — глядзеў бы і глядзеў на яе... Тым больш — не без карысці: навукоўцы сцвярджаюць, што чалавеку, каб заўжды заставацца маладым, трэба як мага часцей глядзець на бягучую ваду, зялёную траву і прыгожых жанчын (ці мужчын).

Пэўнае кола нашых чытачоў аніколі, відаць, не пастарэе, бо глядзіць менавіта на тое, на што трэба, яшчэ і на здымку (кіньце вокам на верхні. — **Аўт.**), а потым прыдумвае подпіс: аб ўзросце — ці не ў першую чаргу:

*Праляцелі, як вецер, гады,*
*Калі й Ясь за рэкорды змагаўся...*
*А цяпер, бач, і хуткай язды,*
*І халоднай вады забаяўся.*
*Кажа: «Лепш зашпіліць пінжачок*
*І глядзець на байдаркі здалёк».*

Каму ён так сказаў? Ды **спадарыні Раісе Васільевай з Гомеля** (з берагоў таго Сожа). І, напэўна ж, меў рацыю? Больш за тое, у пошце ёсць меркаванне, што якраз яна, рацыя, на плыце і стаіць. Але пра гэта — пазней. Пакуль — тая ж тэма ўзросту вачыма **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў:**

*Рэкорды, гонкі — ўсё ў нябыт...*
*Ды цягне рэчка ветэрана!*
*Зноў веславаць? Не гэткі спрыт...*
*Ён змайстраваў з асінак плыт —*
*Хоць нейкі ды бальзам да раны!*

А яшчэ, вядома ж, карысць, якую ўбачыў на здымку **спадар Віктар Трайкоўскі з Мінска:**

*Байдаркі міма праплываюць —*
*К медалям рвуцца маладыя...*
*Таксама — куляй пралятаюць*
*Дзянёчкі нашы залатыя.*
*І ўжо тады мы не ў пагоні —*
*Стаім слупамі на плыту:*
*Прайшлі гады, прамчалі коні,*
*Мы ловім рыбку... Хоць кату.*

Гэта — вельмі ўдзячны ядок, прыемны занятак... І ў працэсе яго (што дакладна ведае **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч**), бачыцца не толькі паплавок, але і многае, многае іншае:

*На сярэдзіне ракі*
*Рух — вяслуюць юнакі...*
*Дзядзька Хведар пазірае*
*Ды сам-насам разважае:*
*— Эх, каб скінуць мне гады*
*І вагі хоць два пуды —*
*Так імчаў бы — рэзаў хвалі,*
*Вы б з маторкай не дагналі!*

Але ж гэта — і гады, і мінус 32 кілаграмы — не што іншае, як «мары-кралі»! «О, каб яны ды праўдай сталі!» — пісаў наш класік.

І, напэўна ж, шкадаваў... Як шкадуюць, зайздросцяць іншыя: пажылыя — што яны не маладыя, моладзь — часам якраз наадварот. Хоць рабіць гэта не варта, бо ў абодвух узростаў (як мяркуе **спадар Мікалай Старых з Гомеля**) ёсць свае мінусы і свае плюсы. Кшталту:

*Як вам добра, весляры:*
*Не кусаюць камары,*
*Вы сягаеце у далі,*
*І чакаюць вас медалі...*
*Без бяды і рыбалову*
*(Калі нават без улову),*
*Бо няма ў яго турбот:*
*За спіной — шуміць чарот,*
*Для «сугрэву» ёсць «кампот»...*

Ці не ўсё гэта, разам узятае, і вабіць людзей — многіх... **Спадарыня Ніна Бурко з вёскі Капланцы Бярэзінскага раёна** піша пра аднаго, але ж вельмі тыповага:

*У Маланкі нашай зяць —*
*Якіх трэба пашукаць:*
*Цешча просіць што зрабіць, —*
*У яго нага баліць!*
*Калі ж вуду ў рукі даць,*
*Суткі можа прастаяць!*

Адкуль выснова:

*Лоўля плотак ды лінёў —*
*Гэта хобі гультаёў.*

Дарэчы, у аднаго такога (дакладней — у адной, што ў Мінску, на беразе Сожа сядзела), спыталіся, якую яна рыбу хоча злавіць. Адказ быў досыць нечаканым: «Кабачок!» Людзі ёй: «Ды няма такой рыбы!» Яна ім (пакрыўджана): «Як гэта: ікра — ёсць, а рыбы няма?»

Ну сапраўды, не лагічна ж!

Якраз яна, логіка, прычым жалезная, на думку **спадара Валерыя Гаўрыша**, пакладзена ў аснову новага метаду трэніроўкі весляроў (трэнер — зірніце — на мосціку):

*Так, прыгажосць —*
*вельмі страшная сіла,*
*Шмат чэмпіёнаў яна спарадзіла...*
*Гэтую прагу хлапечых вачэй*
*Трэнер заўважыў, і стала лягчэй:*
*Старт ён дзяўчыне спачатку дае,*
*Хлопцам крычыць:*
*«Даганяйце яе!..»*
*Хто як стараецца, усе на віду —*
*Стой на мастку сабе, плюй у ваду...*

А калі збрыдзее, можна «таталізатар» падключыць (разам са **спадаром Міколам Кісялём з Мінска**), «паспрачацца», хто калі прыйдзе да фінішу. Кшталту:

*Узняліся вёслы,*
*Заблішчэлі пырскі...*
*Трэнер — дзед дарослы,*
*Усім малюе «рыскі».*
*Ён — нібы вяльможа...*
*Ды наўрад ці знае,*
*Хто тут пераможа,*
*Хто з іх як прайграе...*

Без гэтага падчас спаборніцтваў, згадзіцеся, нельга. Без допінгаў ды ашуканства, здараецца, таксама. Сведчаннем таму — спроба «інтэрв'ю» (з таго ж канверта):

*— Ты прыйшла на фініш першай!*
*Як магчыма гэта стала?..*
*Адказала дзеўка «вершам»:*
*— Я ўсім цэглы падвязала.*

«Знаходлівая», праўда? Ці прадпрымальная? Як, дарэчы, і трэнер. Ці суддзя? На думку **спадарыні Валянціны Гудачковай**, ён (ну, той, што на мосціку), не адстае ні ад павеваў моды, ні ад патрабаванняў часу. А зрэшты, мяркуйце самі:

*Быў не промах дзед Міхед*
*На плыце адкрыў... буфет,*
*Каб спартсмены падплывалі,*
*Піражкі з капустай бралі...*
*А начальства завітае,*
*Дык і юшкі паспытае.*

Жаданне дагадзіць яму (ці, як мінімум, пачаставаць), мусіць, у крыві ў нас? А таму ў гэтага прадпрымальнага дзеда (паводле **спадара Анатоля Гарачова з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна**) «усё схоплена»:

*Як з сабою маеш прымус —*
*Будзе юшка нібы цымус!*
*Ёсць для стравы лыжка-міска —*
*Акунькі праскочаць слізка,*
*Ёсць паўлітра? Хлеба скіба?*
*Дык навошта й тая рыба?*

Анекдот да слова: маці ў парку так гучна крыкнула дзіцяці «Кінь каку!», што трое мужыкоў, азірнуўшыся, кінулі ў куст пластыкавыя чаркі, двое — недакураныя цыгарэты, а адзін — адхіснуўся ад прыгожай бландзінкі.

І, напэўна ж, правільна зрабілі! Усе, бо ад бяды, ад граху падалей...

Сведчаннем таму і... сам конкурсны здымак, і подпіс да яго ад **спадарыні Соф'і Кусянковай з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна**. Паводле яго падзеі, што трапілі ў гэты кадр, развіваліся прыкладна так:

*Жоўценькі пясочак,*
*Дзеўкі на каноэ...*
*Не адцягнеш дзеда*
*Нават пад канвоем.*

Ён, гэты дзед, як мяркуе **спадарыня Валянціна Гудачкова**, нават бліжэй падплыў бы. Што перашкаджае? Чытайце:

*Вось... Надумала галоўка*
*Кругасветную вандроўку:*
*Дзедка слова даў (і цвёрда!)*
*На плыце пабіць рэкорды!*
*...Мару здзейсніць—*
*што раз чхнуць,*
*Калі плыт той... падпіхнуць.*

І ўжо тады ён, маленькі (дарэчы, харошая песня была ў Юрыя Лазы!), вядома ж, паплыве... Можа стартаваць нават цэлая рэгата. А вось адкуль і куды, «паваражыў» **спадар Анатоль Гарачоў**:

*Ёсць версія, але адна*
*(Хоць і адной не вельмі мала):*

Фота Анатоля КІПЕЦЬЧУКА.

*Запрасіў аднойчы дзед*
*Восем «рыбак» на абед.*
*Дзеўкі добра пасядзелі,*
*Папілі ўсё і паелі,*
*А як дзед зрабіў намёк,*
*У байдаркі гужам — скок!..*
*Не ў твае гады ўжо, дзед,*
*«Рыб» вадзіць у «кабінет».*

Чаму? Адказ на гэтае кароткае пытанне ў **спадара Міколы Кісяля**. Ён, відаць, у асобе таго дзеда сам сябе ўбачыў, прычым... галасуючым. Вось і выдаў:

*Сонца ўжо на схіле,*
*А яны — «галопам»...*
*— Тармазні на хвілю,*
*Бачыш — аўтастопам...*
*Не бяруць вясляркі,*
*Пруцца ўхаластую...*
*Кажуць: перастарак.*
*Што яшчэ? Не чую...*

(У адной свекрыві пыталіся, як гэта яна, разам жывучы, з абедзвюма нявесткамі ладзіць. «Проста, — схітравала жанчына, — я трохі слепаватая, трохі глухаватая...» Гэта, відаць, і ратуе жанчыну.)

Што да мужчын, то яны, як вядома, іншыя. Паводле таго ж **спадара Міколы Кісяля**:

*Аднойчы ранкам з Лучына*
*Рэгата дружна стартавала.*
*Ва ўсіх цудоўны быў настрой,*
*Ды прыпынілася рэгата.*
*Магчыма, што... бензапілой.*
*А мо і звараж-аўтаматам?*

Тое, што ляжыць побач з левай нагой «гультая», «рыбака», «прадпрымальніка», «трэнера», «суддзі», «вандроўніка», «лавеласа» (усе шышкі на адну галаву!), і сапраўды — прыгледзьцеся — падобна да бензапілы (ці зваркі-аўтамата?). А можа...

Некалі адзін пісьменнік у сваім творы напісаў, што партыец Н. меў рацыю. «Што гэта значыць?!» — абурыўся рэдактар. «Ну, тое, што гаварыў ён слушна, абгрунтавана». — «Гэта правільна! Інакш і быць не можа! Але адкуль у яго рацыя? І навошта яна партыйцу?»

У спадара Гарачова наконт гэтага меркаванняў няма. А вось наконт пераможцаў конкурсу — ёсць. На папярэднім этапе яго, калі вы помніце («Звязда», 26 чэрвеня г.г.), на здымку прыгожая кароўка была пад паказальнікам «Канец Новага Двара», калі можна так сказаць. Найлепшыя радкі пад гэты здымак, на думку спадара Анатоля ды іншых сяброў вялікага чытацкага журы, напісалі сужэнцы Астроўскія, спадары Мікола Кісель, Валерый Гаўрыш, Анатоль Гарачоў, спадарыні Валянціна Гудачкова, Соф'я Кусянкова і аўтарка сённяшняга загалоўка **Ніна Мацвеёўна Бурко**.

З гэтым, апошнім меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае — рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на трэці квартал бягучага года накіроўваецца на бераг рэчкі Клявы, у **вёску Капланцы Бярэзінскага раёна**.

Вы хочаце, каб да вас? Тады выпісвайце газету — на месяц, на квартал, на паўгоддзе. Альбо ўважліва глядзіце на чарговы конкурсны здымак, прыдумвайце подпісы (у кожным — не больш за восем радкоў) і дасылайце ў рэдакцыю. Загадзя ўдзячныя!

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЯК ПАСКОРЫЦЬ ПАСПЯВАННЕ ПАМІДОРАЎ

Яшчэ крыху — і лета скончыцца. Ночы становяцца халаднейшымі, а ў агароднікаў пачынаюцца традыцыйныя спаборніцтвы з восенню: хто каго перагоніць. Ці мы зможам максімальна захаваць ураджай «на корані» да самых маразоў, ці непагадзь у адно імгненне змахне з кустоў усё зялёным і недаспелым. Асабліва востра ўстае пытанне даспявання зялёных памідораў, таму што на кустах яшчэ шмат завязяў і зусім маладых пладоў, а цёплых дзён застаецца ўсё менш.

Ёсць некалькі спосабаў, якія дадуць зразумець таматным кустам, што трэба «дабавіць хуткасці» і пачаць чырванець хутчэй. І гэтыя спосабы павінны прымяняцца ўжо сёння, у рэжыме «хуткай дапамогі».

**Выдаленне новых кветканосаў**

Новыя бутоны і кветкі, якія расліна працягвае «выганяць», на сённяшні дзень ужо проста непатрэбны. Выспець маладзенькія памідоры ўсё роўна не паспеюць, а сілы ў куста забяруць, таму ўсе верхавіны высакаросłых кустоў трэба прышчыпнуць або абрэзаць, выдаліць і ўсе суквецці. На сярэдняросłых і нізкаросłых кустах (нават калі вельмі шкада) давядзецца выдаліць усе «лішнія» кветкавыя гронкі — на вялікую колькасць пладоў у іх ужо не хопіць сіл.

**Вызваленне куста ад ніжняга лісця і пасынкаў**

Неабходна агледзець усе кусты і выдаліць новыя парасткі. І ўсё ніжняе лісце, аж да тых, на якіх спеюць памідоры, — таксама.

**«Сонечнае» арыентаванне**

Каб кусты памідораў атрымалі максімум восеньскага сонца, паспрабуйце прыбраць усе лішнія лісты, а галінкі разгарнуць максімальна насустрач святлу. Гэта лёгка зрабіць пры дапамозе падвязачнага матэрыялу, а галінкі нізкаросłых кустоў можна зафіксаваць распоркамі або прывязаць да дадатковых калкоў.

**Ёдзістая падкормка**

Вядома, што падкормка ёдам паскарае паспяванне таматаў. Правядзіце 1-2 пазакаранёвыя падкормкі па лісці слабым растворам ёду (з разліку 30-40 кропель на 10 літраў вады) — гэта пойдзе толькі на карысць.

**Прафілактыка фітафтарозу**

Хоць ужо і восень «на носе», але прафілактыку фітафтарозу спыняць не рэкамендуецца. Можна ў сухое цёплае надвор'е апырскаць памідоры настоем часнаку (гэта будзе дакладна ўжо ў апошні раз). Калі памідоры растуць у адкрытым грунце, пажадана арганізаваць на ноч укрыццё кустоў плёнкай. Гэта таксама абароніць памідоры ад фітафтарозу: кусты не будуць макрэць ад расы, і плады застануцца сухімі.

**Прымусовае абмежаванне харчавання**

Часам практыкуюць даволі дзіўныя, на першы погляд, метады, якія спрыяюць хуткаму паспяванню памідораў. Сэнс іх зводзіцца да таго, каб абмежаваць паступленне пажыўных рэчываў у расліну, а дзеянні нагадваюць хірургічную аперацыю:

• на вышыні 10-12 см ад зямлі ў сцябле памідора лязом робіцца скразны разрэз, у які адразу ж устаўляецца падрыхтаваная загадзя плоская драўляная пласцінка памерам 0,5 х 2 см — такі разрыў тканін не перакрывае, але істотна абмяжоўвае як прыток пажыўных рэчываў, так і іх адток;

• на гэтай жа вышыні тонкім медным дротам нямоцна перацягваецца сцябло папярок, і гэтая перацяжка фіксуецца. Дасягаецца той жа абмежавальны эфект;

• куст бяруць за ніз сцябла і трохі выцягваюць з глебы — да слабага храбусцення тонкіх карэньчыкаў. Куст адпускаюць, а надарваныя карэньчыкі перастаюць працаваць — дастаўляць ваду і пажыўныя рэчывы.

**«Выхаванне прыкладам»**

Даўно вядомы факт: калі пакласці побач з зялёнымі памідорамі саспелы, то пачырваненне няспелых сабратаў значна паскараецца. Гэтаму ёсць простае тлумачэнне: вылучэнне саспелымі памідорамі этылену (як каталізатара). Дык вось, калі наўпрост на гронкі зялёных памідораў «надзець» пакецік з чырвоным плодам унутры і, прывязаўшы да сцябла, пакінуць на тры дні, а потым зняць, то літаральна на 2-3-я суткі зялёныя памідоры пачнуць бурэць, тады як натуральным шляхам гэты працэс пачаўся б толькі праз 2,5-3 тыдні.

**Алкагольнае стымуляванне**

Калі праз гняздо зялёнага памідора шпрыцам увесці ўнутр 0,5 мл гарэлкі, то паспяванне паскорыцца (і праз 15-16 дзён, магчыма, ён цалкам паспее). Прычым навукоўцы гарантуюць, што хімічны склад такіх «падпітых» таматаў нічым не будзе адрозніваццца ад звычайных.

**Збор бурых пладоў**

Каб даць магчымасць выспець як мага большай колькасці памідораў на кустах, бурыя плады трэба здымаць. Яны ўжо здольны дайсці да спеласці пры хатнім даспяванні, а куст кіне ўсе сілы на зялёныя памідоры, якія засталіся.

**Перасяленне пад дах**

Калі халады ўжо наступілі, а на памідорных кустах яшчэ шмат зялёных пладоў, можна, вырваўшы расліны з глебы разам з каранямі, перамясціць іх у закрытае памяшканне — хлеў, бытоўку або гараж, дзе і падвесіць. Тады працэс паспявання будзе працягвацца амаль натуральным шляхам, «на корані».

Даты Падзеі Людзі

## 19 ЖНІЎНЯ

*Сусветны дзень фатаграфіі. Адзначаецца з 2010 года. 19 жніўня 1939 года ўрад Францыі, які купіў патэнт французскага хіміка і вынаходніка Луі Жака Мане Дагера пра метад атрымання адбітка (дагератыпаў), зрабіў адкрыццё дагератыпа здабыткам сусветнай грамадскасці.*

**1910** год — 105 гадоў таму нарадзіўся (г. Сянно) Алесь Жаўрок (Аляксандр Дзмітрыевіч Сінічкін), беларускі паэт. У 1938 годзе скончыў Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры. З 1939-га — ваенны карэспандэнт армейскай газеты «В бой за родину». Аўтар паэтычных зборнікаў «Ручаі», «Днепр выходзіць з берагоў», паэм «Крывёю сэрца», «Пра майго таварыша» і іншых. Напісаў лібрэта аперэты «Зарэчны барок». Загінуў у 1942 годзе ў баі пад Сталінградам.

**1936** год — у Маскве пачаўся судовы працэс па справе так званага трацкісцка-зіноўеўскага «Аб'яднанага цэнтра». Па справе былі прыцягнуты 16 чалавек, сярод іх — Г. Зіноўеў, Л. Каменеў, Г. Еўдакімаў. Яны абвінавачваліся ў тым, што, будучы нібыта з'яўляючыся членамі падпольнай трацкісцка-зіноўеўскай тэрарыстычнай арганізацыі, актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы забойства кіраўнікоў партыі і ўрада. На думку абвінавачання, восенню 1932 года падпольная трацкісцкай арганізацыя ў СССР, выконваючы ўказанні Л. Троцкага з-за мяжы, аб'яднала намаганні з падпольнай зіноўеўскай арганізацыяй. Утварыўся «Аб'яднаны цэнтр». Канчатковая мэта іх была, паводле следства, — захоп улады. Як сцвярджала абвінавачванне, змоўшчыкі не цешылі сябе надзеяй заручыцца падтрымкай народа, бо пад кіраўніцтвам Сталіна СССР паспяхова будаваў сацыялізм. Заставалася толькі адно — забіць Сталіна і іншых правадыроў партыі і ўрада. Усе падсудныя былі прыгавораны да расстрэлу. У 1988 годзе Пленум Вярхоўнага Суда СССР прысуд адмяніў і справу спыніў за адсутнасцю ў дзеяннях асуджаных складу злачынства.

**1960** год — савецкая ракета вывела на арбіту карабель «Усход», на борце якога знаходзіліся сабакі Белка і Стрэлка. Мэтай эксперымента было даследаванне ўздзеяння касмічнага выпраменьвання на жывыя арганізмы, а таксама праверка эфектыўнасці розных сістэм жыццезабеспячэння — харчавання, водазабеспячэння, асенізацыі, рэгенерацыі адходаў. Карабель абсталявалі медыка-біялагічнай апаратурай, якая фіксавала змены, якія адбываліся ў арганізмах сабак на працягу ўсяго палёту. Для яго сабакам пашылі спецыяльныя касцюмы чырвонага і зялёнага колераў. Акрамя сабак, на борце знаходзіліся два белыя пацукі і некалькі мышэй. Старт адбыўся з касмадрома Байканур у 15 гадзін 44 хвіліны. На наступны дзень спускаемы апарат з жывёламі на борце ўдачна прызямліўся ў зададзеным раёне. Жывёлы, якія вярнуліся з арбіты, сталі аб'ектам павышанай увагі і праз суткі ўжо «прымалі» ўдзел у прэс-канферэнцыі, наладжанай у будынку ТАСС. Стрэлка пакінула пасля сябе шматлікае патомства. А адзін з яе шчанюкоў — Пушок — быў падараны жонцы амерыканскага прэзідэнта Жаклін Кенэдзі.

Было сказана

**Люба ТАРАСЮК, паэтэса:**

*«Уся зямля — адзін стары курган,*
*куды сышліся нашых продкаў продкі».*

## Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

Збожжавыя расліны. Насенне ўсіх традыцыйных для Беларусі культур (жыта, аўса, ячменю, пшаніцы, проса) было асноўным абрадавым атрыбутам у кантэксце каляднага абраду «Засеўкі», які выконваўся падлеткамі 14 студзеня (яны заходзілі ў кожную хату і «засявалі» падлогу насеннем розных культур, каб у наступным годзе ў гаспадара быў добры ўраджай збожжавых). Менавіта насенне гэтых культур станавілася галоўным падчас абходу вёскі з лубкай на Багач, калі святкавалі заканчэнне збору ўраджаю. Аднак сярод збожжавых раслін традыцыйна на першае месца ставілі жыта, потым пшаніцу і ячмень.

◈ Ячмень лічыцца адной з самых старажытных раслін у земляробстве ўсходніх славян. Ён заўсёды сімвалізаваў пладанаснасць, адраджэнне жыцця і яго аднаўленне.

◈ Адна з галоўных рытуальных страў сямейна-родавага цыкла «Бабіна каша», якую рыхтавала бабка-павітуха на радзіны, была з ячменных круп.

◈ Лічыцца, што адным з першых п'янлівых напояў, якія навучыліся рабіць людзі, была ячменная брага.

◈ Ячмень імкнуліся сеяць, калі цвіце каліна.

◈ Лічылася: калі спеў салаўя сціхае, калі ячмень пачынае каласіцца, то гаспадар будзе з ураджаем.

◈ У творчасці ўсходніх славян жыта — гэта ўдава, а пшаніца — дзеўка ці маладая жонка — малодка.

◈ Пшанічны хлеб пяклі ў святы і на вяселле (каравай). Падчас святкавання «гукання вясны» кожная гаспадыня абавязкова выпякала печыва ў выглядзе птушак з «белай» мукі.

◈ Для таго, каб быць з ураджаем пшаніцы, раілі сеяць гэтую культуру ў час, калі красуе чаромха.

◈ Каб прадказаць, ці ўдалым будзе год для пшаніцы, у Чысты чацвер з храма неслі палаючыя свечы: і калі яны не згаслі па дарозе дамоў, то меркавалі, што будуць «з белым хлебам».

Дарагую жонку, матулю, цешчу, бабулю
**Тамару Макараўну Бельскую** з вёскі Чарневічы
Глыбоцкага раёна шчыра віншуем з 70-годдзем!
Любім!.. Дзякуем за клопат пра нас!
Зычым дабра і здароўя.
**Муж, дачка, зяць і ўнучкі.**
*Ад нас пажаданне ў твой юбілей:*
*Жыві год да ста! І штодня маладзей!*

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 5.54 | 20.31 | 14.37 |
| Віцебск | 5.40 | 20.25 | 14.45 |
| Магілёў | 5.44 | 20.21 | 14.37 |
| Гомель | 5.45 | 20.14 | 14.29 |
| Гродна | 6.10 | 20.46 | 14.36 |
| Брэст | 6.15 | 20.42 | 14.27 |

**Месяц**

***Маладзік 14 жніўня.***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

**Імяніны**

***Пр.*** *ДРУГІ СПАС (Праабражэнне Гасподняе).*
***К.*** *Канстанцыі, Андрэя, Баляслава, Юльяна, Яна.*

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ЗАЎТРА




**...у суседзяў**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | +22..+24°С | КІЕЎ | +19..+21°С | РЫГА | +21..+23°С |
| ВІЛЬНЮС | +20..+22°С | МАСКВА | +20..+22°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ | +21..+23°С |

## УСМІХНЕМСЯ

**Муж сказаў, што паміж намі няма іскры.**

**Купіла электрашокер. Ачуняе — спытаю яшчэ.**

Памятаю, калі я першы раз убачыў «Запарожац». Дзед адкрыў сперади капот, кінуў туды бярэмя дроў і паехаў. Доўга яшчэ потым лічыў, што «запарожцы» ездзяць на дровах.

**— Ты калі-небудзь дакранаўся да сіліконавых грудзей?**

**— Так.**

**— Ну, і як яны навобмацак?**

**— Ведаеш, такое адчуванне, як быццам глючыць гідраўзмацняльнік руля.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3257.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 жніўня 2015 года.